## Беларусь бачыць выгаду ад АЭП у выпадку забеспячэння роўных правоў для суб'ектаў гаспадарання ўсіх трох краін

**Такі пункт гледжання выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй мажыліса парламента Казахстана Уралам Мухамеджанавым, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«У нас адкрываюцца каласальныя магчымасці з пачаткам работы Адзінай эканамічнай прасторы. Вядома ж, будуць складанасці і цяжкасці, нам не пазбегнуць і крытыкі, яна ўжо з'явілася, не пазбегнуць адкрытай канкурэнцыі, процідзеяння, гэта зразумела, але мы поўныя рашучасці прайсці гэты шлях дастойна». Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Казахстану за падтрымку Беларусі на міжнароднай арэне. Ён падкрэсліў, што ў дзвюх краін няма разыходжанняў па пазіцыях міжнароднага парадку дня. «Мы самыя блізкія дзяржавы ў гэтым свеце, Беларусь, Расія і Казахстан, якія вырашылі кінуць выклік часу і стварыць моцную эканамічную інтэграцыйную структуру, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Многае ў нас ужо атрымалася, нават не толькі ў арганізацыйным плане, але і ў практычным».

## ЯК ПРАВІЛЬНА АКРУГЛЯЦЬ ЦАНУ?

**У Мінгандлю ад суб'ектаў гаспадарання пачалі паступаць пытанні адносна парадку акруглення рознічных цэн (тарыфаў). Падрыхтаваны адпаведныя рэкамендацыі.**

Рознічная цана (тарыф) акругляецца за прынятую адзінку вымярэння (штуку, дзясятак, метр, кілаграм, літр і г.д.). Значэнне ў суме да 25 рублёў адкідваецца, ад 25 рублёў уключна да 75 рублёў акругляюцца да 50 рублёў, ад 75 рублёў уключна і вышэй акругляюцца да 100 рублёў. Пры вызначэнні рознічных цэн на камплект (гарнітур, набор), які збіраецца ў арганізацыях гандлю з тавараў, што рэалізуюцца, акругляецца цана кожнага вырабу, які ўваходзіць у камплект. Пасля сумíравання рознічных цэн, з улікам акруглення цаны кожнага вырабу, цана камплекта не акругляецца. Пры вызначэнні цаны на камплект у цэлым (пры адсутнасці цэн на асобныя вырабы, што ўваходзяць у камплект) акругляецца цана камплекта. У гандлёвых аб'ектах грамадскага харчавання акругляецца прадажная цана стравы, вырабу, порцыі. Пры рэалізацыі вагавага і мернага тавару акругляецца кошт кожнай пакупкі (адвесу)...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «Беларусь чакае ад сваіх пісьменнікаў яркіх і таленавітых твораў»

### У сучаснай беларускай літаратуры не павінна быць цэнзуры або забароненых тэм

«У сучаснай беларускай літаратуры не павінна быць цэнзуры або забароненых тэм, акрамя, зразумела, антыгуманных і амаральных». Звяртаючыся да пісьменнікаў, ён папрасіў смела ўзнімаць у сваіх кнігах сацыяльныя, светапоглядныя і маральныя праблемы сучаснасці. «Але не апускайцеся да вульгарнага ачарнення і пошласці». Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, чытач чакае сур'ёзных, маштабных твораў, якія зламалі б стэрэатыпнае ўяўленне аб беларусах як аб вечна прыгнечаным, пасіўным і цёмным народзе. «На самай справе беларускі народ выстаяў перад тварам многіх трагедый, войнаў і катастроф. Менавіта характар чалавека, яго духоўныя сілы заўсёды былі ў цэнтры самых значных мастацкіх твораў. І сёння вострa стаіць праблема героя-сучасніка».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускія літаратары, асабліва маладыя, нярэдка кіруюцца далёка не лепшымі ўзорамі масавай культуры замест таго, каб вучыцца ў класікаў і браць сюжэты з жыцця. «Навейшая гісторыя Айчыны павінна стаць прадметам сур'ёзнага творчага аналізу. Патрэбны яркія, таленавітыя кнігі аб сённяшняй Беларусі і жыцці нашых землякоў. Мы заўсёды знойдзем сродкі, каб выдаць іх і дастойна аплаціць працу аўтараў». Ён таксама даручыў Міністэрству інфармацыі навесці парадак у ганарарнай палітыцы, каб пісьменнікам не даводзілася па 5-7 гадоў чакаць атрымання заробленых грошай. Разам з тым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што і пісьменнікі не павінны забываць пра адваротны бок медаля, маючы на ўвазе неабходнасць звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на мастацкую якасць і запатрабаванасць твораў. Апошняе застаецца сур'ёзнай праблемай. Так, паводле даных кіраўніка дзяржавы, да канца 2010 года не рэалізаваныя астаткі сацыяльна значных кніг выдавецтва «Мастацкая літаратура» складалі амаль 50 працэнтаў ад усіх выпушчаных назваў і 30 працэнтаў ад іх тыражу. «Можа, не тое выдавалі? — паставіў пытанне Прэзідэнт. — А між тым пералікі прапанаваных да выдання твораў складаюцца сумесна з Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Прычым у гэтых спісах, як, зрэшты, і на старонках часопісаў, часта з году ў год, з нумара ў нумар мільгаюць адны і тыя ж аўтары. Дык чым жа вы кіруецеся: мастацкім здабыткам ці іншымі меркаваннямі?»

На думку кіраўніка дзяржавы, заўтрашні дзень беларускай культуры — у руках маладых літаратараў, тых, хто пакуль яшчэ толькі шукае сябе. «Трэба шырэй выдаваць іх і прадстаўляць на старонках літаратурных часопісаў. Але ў першую чаргу ім патрэбны парада і падтрымка пісьменнікаў старэйшага пакалення — каб не перапынялася традыцыя айчыннай літаратуры».

### Беларуская літаратура павінна больш актыўна прысутнічаць у айчынным медыяпрасторы

Кардынальнага перагляду патрабуе работа па прапагандзе кнігі. «Міністэрству культуры і беларускім тэлерадыёкампаніям варта падумаць аб адраджэнні практыкі экранізацыі твораў нашых пісьменнікаў, аб стварэнні фільмаў і праграм аб іх творчасці. Эфектыўным сродкам далучэння да літаратуры маладога пакалення можа стаць стварэнне беларускіх аўдыякніг». Магчыма, мае сэнс аднавіць практыку напісання п'ес па дзяржаўным заказе, ажыццяўляць прыярытэтнае фінансаванне спектакляў па творах беларускіх драматургаў. Выхаванне падрастаючага пакалення павінна грунтавацца на лепшых узорах айчыннай і сусветнай класікі. «А для гэтага неабходна перагледзець і школьныя праграмы, выключыць другарадных аўтараў, выдзяляць больш часу на сапраўды вялікія творы», — лічыць беларускі лідар. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка лічыць, што магутным сродкам абуджэння грамадскай цікавасці да нацыянальнай літаратуры і культуры павінна стаць святкаванне 130-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа. «Адзначыць яго трэба без лішняй помпы, але дастойна».

Кіраўнік дзяржавы прапанаваў удзельнікам сустрэчы адкрыта выказаць свае прапановы і меркаванні аб далейшым развіцці айчыннай літаратуры. «Хачу, каб гэта размова была адкрытая, сумленная і прынцыповая».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Абзац

**◢ У Баранавіцкім раёне 23 кастрычніка адбыліся два ДТЗ з-за дзікоў, якія раптоўна выбеглі на дарогу. Абедзве аварыі зафіксаваны на трасе Брэст — Мінск — граніца РФ. Першае ДТЗ адбылося ў 18.45 прыкладна за 10 км ад Баранавічаў. Перад аўтамабілем «Мазда-6», за рулём якога знаходзіўся 45-гадовы жыхар Брэста, на дарогу выбегла некалькі дзікоў. На аднаго з іх кіроўца наехаў. Другая аварыя зарэгістравана прыкладна ў 22.00 на 183-м км недалёка ад мяжы Баранавіцкага і Івацэвіцкага раёнаў. Дзік раптоўна выбег на дарогу перад аўтамабілем «Опель-Вектра», якім кіраваў 49-гадовы брастаўчанін. У абодвух ДТЗ кіроўцы не пацярпелі. Аўтамабілі атрымалі механічныя пашкоджанні. Жывёлы ў выніку наездаў загінулі на месцы.**

## Поўны абзац



◢ У балгарскай вёсцы Нова Жалязарэ (Плоўдзіўская вобл.) арыштавана каза. Жывёліна абвінавачваецца ў незаконнай агітацыі падчас правядзення прэзідэнцкіх і мясцовых выбараў. Як высветлілася, рагаты агітатар хадзіў па вясковых вуліцах з напісанай на тулаве лічбай 22 — пад такім нумарам быў зарэгістраваны кандыдат у мэры горада. Пільныя вяскоўцы распазналі ў такім жэсце грубае парушэнне выбарчага заканадаўства і паскардзіліся праваахоўнікам. Пасля непрацяглай пагоні казу злавілі і завялі ў хлеў, а там «адмылі ад палітычных інтрыг». Знайсці аўтара такога незвычайнага агітацыйнага плаката не ўдалося.

**◢ У Баварыі п'яны кіроўца грузавіка праліў на трасу 20 тон віна. Раніцай ён выязджаў на трасу, каб ехаць у кірунку Нюрнберга, аднак не справіўся з кіраваннем, і прычэп, дзе знаходзілася віно ў бутэльках, перавярнуўся. Віно ракою палілося на дарогу. Паліцыя ўстанавіла, што кіроўца быў за рулём у стане алкагольнага ап'янення. Тэст выявіў утрыманне 1,5 праміле алкаголю ў крыві. Сам кіроўца не пацярпеў. Побач з машынай на той момант таксама нікога не было. Аднак з-за аварыі паліцыі давялося перакрыць рух на працягу некалькіх кіламетраў. Матэрыяльныя страты склалі больш за 50 тыс. еўра.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## Ну і ну!

### А ЯК ЖА МАТЧЫН ІНСТЫНКТ?

**Гаспадыня дома і маці сямі дзяцей раніцай прыняла спіртныя напоі, прыйшла дахаты, запаліла і лягла спаць. Прачнулася ад паху дыму і пакінула хату. Пры гэтым малодшы сын заставаўся ў доме.**

Гэта — тлумачэнні 41-гадовай жанчыны спецыялістам МНС, якія тушылі пажар у вёсцы Цішкаўка Рэчыцкага раёна. 4-гадовы хлопчык аказаўся кемлівы і выбраўся на ганак самастойна, калі дом ужо гарэў. На шчасце, тры старэйшыя сыны разам з бацькам, які характарызуецца станоўча, былі на працы. Яшчэ двое дзяцей — у школе, і адзін — у сябра. Поўнасцю знішчаны дах і маёмасць у хаце. Хлопчык дастаўлены ў Рэчыцкую бальніцу, дзе падазрэнне на атручванне прадуктамі гарэння не пацвердзілася. А вось нецвярозая маці паспела атрымаць апёкі верхніх дыхальных шляхоў і шпіталізавана. Як расказала кіраўнік справамі Караваціцкага сельскага Савета Кацярына Ус, сям'і будзе прапанавана жыллё з фонду, які ёсць у сельсавеце, а пакуль пацярпелыя размешчаны ў сваякоў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### «УРАЛАМ» — НА ДЗІКА Ў КУКУРУЗЕ

**На сельскагаспадарчым полі ў арандаваных угоддзях Берастаўіцкай раённай структуры таварыства паляўнічых і рыбаловаў вядзецца незаконнае паляванне на дзіка з выкарыстаннем грузавіка — такі сігнал атрымалі работнікі Гродзенскай аблінспекцыі. Выехалі на месца і сапраўды заспелі за гэтым заняткам мясцовага жыхара.**

— Незаконнае паляванне вялося без выкарыстання зброі. На полі ўбіралі кукурузу, у чым удзельнічаў і грузавік «Урал» адной з гаспадарак. А ў кукурузе зараз актыўна харчуюцца дзікі. Аднаго з іх, відаць, і заўважылі, пасля чаго паранілі, здзейсніўшы наезд аўтамабілем. Потым жывёлу дабілі каменнем, — паведамілі падрабязнасці здарэння «Звяздзе» ў Гродзенскай аблінспекцыі. Заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# НОВЫЯ ПРАПАНОВЫ ДЛЯ ПЕНСІЯНЕРАЎ

**На днях агульнарасійскі народны фронт (АНФ), лідарам якога з'яўляецца прэм'ер-міністр Уладзімір Пуцін, апублікаваў «Праграму народных ініцыятыў» — прапановы для перадвыбарнай праграмы, з якой «Адзіная Расія» («АР») пойдзе на выбары ў Дзяржаўную Думу.**

У прыватнасці, Народны фронт прапанаваў рэфармаваць пенсійную сістэму: даць грамадзянам права і свабоду самастойна выбіраць пенсійны ўзрост. Дзяржава, у сваю чаргу, будзе гарантаваць больш высокае пенсійнае забеспячэнне тым, хто будзе працягваць актыўную працоўную дзейнасць і аформіць пенсію на тры, пяць, сем ці дзесяць гадоў пазней. Як адзначаецца ў праграме, расійскія і замежныя эксперты сведчаць, што працоўная дзейнасць значна падаўжае актыўнае даўгалецце і прыкметна павялічвае працягласць жыцця чалавека.

«Праграмай народных ініцыятыў» прадугледжаны таксама спецыяльныя праграмы навучання, занятасці і настаўніцтва для асоб перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту, якія маюць намер працягваць працоўную дзейнасць.

А як складваюцца справы з выбарам пенсійнага ўзросту ў нашай краіне? Мы папрасілі пракаментаваць згаданыя пункты праграмы «Адзінай Расіі» **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціну КАРАЛЁВУ**. Вось што яна паведаміла нашаму карэспандэнту:

*Закон Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні» (артыкул 23-1) дае нашым грамадзянам магчымасць уплываць на памер пенсіі і пасля дасягнення пенсійнага ўзросту. Калі працягваць працаваць, адмовіўшыся ад атрымання пенсіі, то яе памер пасля будзе павышаны, прычым такая праца ацэньваецца «даражэй», чым у дапенсійным узросце. Так, калі чалавек дасягнуў пенсійнага ўзросту, працягвае працаваць і не атрымлівае пенсію, то за кожныя два месяцы працы яна будзе павялічана на 1% заробку, што прыняты да разліку пенсіі. Гэта значыць, калі чалавек адмаўляецца ад пенсіі на год, то яна павялічваецца на 6%.*

*Такім чынам, адтэрміноўка звароту па атрыманне пенсіі дазваляе забяспечыць больш важкія пенсійныя выплаты ў той час, калі яны стануць адзінай крыніцай сродкаў існавання. Заўважу, што зараз мы разглядаем варыянты яшчэ большага павелічэння пенсіі за стаж пасля дасягнення агульнавызначанага пенсійнага ўзросту пры адмове ад атрымання пенсіі.*

* * *

Іншая ініцыятыва перадвыбарнай праграмы «АР», што закранае пенсіянераў, — развіццё «зваротнай іпатэкі». Нярэдкія выпадкі, калі ў адзінокіх пенсіянераў ёсць ва ўласнасці жыллё, але няма сродкаў да існавання, гаворыцца ў праграме «АР». Многія з іх пагадзіліся б атрымліваць «дадатковую пенсію» і карыстацца кватэрай да канца жыцця пры ўмове, што пасля іх смерці нерухомасць пяройдзе банку ці іншай арганізацыі, якая забяспечыць ім гэтыя выплаты. На думку аўтараў канцэпцыі, гэта дазволіць спыніць розныя злоўжыванні і ашуканскія схемы з кватэрамі адзінокіх пенсіянераў.

Дарэчы, варта адзначыць, што Мінгарвыканкам летась выступіў з падобнай ініцыятывай, прапанаваўшы адзінокім пажылым людзям аддаць дзяржаве сваю кватэру ў пажыццёвае карыстанне. Наўзамен ім было гарантавана грашовае ўзнагароджанне і годны догляд у камфартабельным доме для пажылых людзей, дзе пенсіянеры будуць мець магчымасць пражываць у аднамесных нумарах з усімі выгодамі.

**Святлана БУСЬКО.**

### БАТЭ І «МІЛАН» ЗГУЛЯЮЦЬ У 20.00

Прэс-служба барысаўскага клуба звяртае ўвагу балельшчыкаў на той факт, што ў сувязі з адменай у Беларусі пераходу на зімовы час, пачатак матча 4 тура групавога турніру Лігі чэмпіёнаў УЕФА паміж БАТЭ і «Міланам» 1 лістапада пераносіцца з **21.45** на **20.00**. Білеты, у якіх абазначаны першы час, сапраўдныя.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў Мандроўскай Зінаідзе Міхайлаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# У Мінску прадаецца кватэра коштам 2 млн долараў



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Трохпакаёвыя кватэры для багатых звычайна маюць плошчу ў межах 120—130 кв. метраў, аднак існуюць і палацы па 170—180 «квадратаў». У такім жыллі квадратны метр каштуе да 2 тысяч USD. Сустракаюцца сярод трохпакаёвак і двухузроўневыя кватэры, але добрым попытам у спажыўцоў падобнае экстравагантнае жыллё не карыстаецца.

У дарагога жылля часам галоўны фактар — гэта прэстыжнае месцазнаходжанне. Напрыклад, у шасціпавярховым доме «сярэдняй элітнасці» па вуліцы Піянерскай, што каля Драздоў, прадаецца трохпакаёвая кватэра плошчай 131 кв. метр. Кватэра без аздаблення, аднак квадратны метр у ёй каштуе 2,5 тысячы долараў.

**Прысутнічае ў Мінску і жыллё для доларавых мільянераў.** Прыкладам такой супер-нерухомасці з'яўляецца трохузроўневая кватэра агульнай плошчай 419 кв. метраў па вуліцы Масквіна. Кватэра цалкам «упакаваная» для камфортнага пражывання. Мае індывідуальны дызайнерскі праект, усю лепшую сусветную мэблю і тэхніку. У кватэры 9 шыкоўных пакояў, трэніровачная зала, джакузі, кандыцыянеры, тры санвузлы і... прыгожы арыгінальны вадаспад. Каштуе гэтая вялікая казка **2 млн долараў**. Калі перавесці ў нашу нацвалюту, то атрымліваецца **17—18 млрд рублёў**.

Зразумела, што такое жыллё разлічана на нейкага кропкавага пакупніка. Напрыклад, гэтая кватэра шукае свайго гаспадара ўжо больш 9-ці месяцаў. Падобнага жылля ў Беларусі адзінкі. Спадар Астапеня лічыць, што ў бліжэйшыя 1—2 гады нейкага істотнага патаннення падобных кватэр не чакаецца, бо яго на рынку амаль няма, а попыт існуе.

Хто потым жыве ў гэтых палацах? Звычайна такія дарагія апартаменты купляюць буйныя расійскія алігархі і багатыя кампаніі. Айчынныя прадпрымальнікі з вялікімі грашыма будуюць сабе элітнае жыллё самастойна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### Жыллё для багатых пачынаецца са 120 тысяч долараў

Сёлета самая сур'ёзная па кошце прапанова невялікіх кватэр існуе ў новабудоўлі па вуліцы Чарвякова. Там у новым элітным доме аднапакаёвая кватэра без аздаблення, агульнай плошчай 49 квадратных метраў прапануецца багатым кліентам за 122,5 тысячы долараў. На другасным рынку максімальныя цэны аднапакаёвых кватэр прыпадаюць на дамы ў цэнтры сталіцы. Агульная плошча аднапакаёвак такога рангу дасягае часам 60 кв. метраў, дзе кошт квадратнага метра кватэр з добрым рамонтам, шафамі-купэ і кухняй складае 1,8—2 тысячы долараў. Атрымліваецца, што гэтыя аднапакаёўкі каштуюць да 120 тысяч долараў.

Дарагія двухпакаёвыя кватэры звычайна маюць агульную плошчу да 80—85 кв. метраў, аднак сустракаюцца «двушкі» і да 100 «квадратаў». Метр жылля ў такіх кватэрах каштуе да 2 тысяч долараў, аднак бываюць і выключэнні. Так, у продажы сёння ёсць двухпакаёвая кватэра агульнай плошчай 75 кв. метраў у доме па вуліцы Бяды. Стартавы кошт гэтай кватэры складае 263 тысячы долараў, а квадратны метр каштуе 3,5 тысячы долараў. Дарагая кватэра мае індывідуальны дызайнерскі праект і ўпакавана сучаснай мэбляй і бытавой тэхнікай, аднак... Сам дом не цалкам адрозніваецца неабходнай «суперэлітнасцю», таму гэтая кватэра ў ім павінна з часам патаннець. Увогуле тэрміны продажу дарагіх кватэр складаюць не менш як 4 месяцы нават з улікам магчымых сур'ёзных зніжак.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ПРАГНОЗ СПЕЦЫЯЛІСТА

**Пакінем дарагое жыццё багатым. Нас больш цікавіць тое, што будзе з цэнамі на стандартнае жыллё ў Мінску ў бліжэйшай перспектыве.**

**Першы намеснік гендырэктара Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКОДАН» Павел АСТАПЕНЯ** лічыць, што ў бліжэйшыя месяцы колькасць здзелак куплі-продажу кватэр на другасным рынку сталіцы можа нават павялічыцца. Чаму? Цяпер першасны рынак жылля перажывае не лепшыя часы, бо звужаецца аб'ём долевага будаўніцтва і іншага камерцыйнага будаўніцтва за кошт змяншэння льготнага крэдытавання і іншай фінансавай дапамогі гэтаму сектару з боку дзяржавы.

Разам з тым, у сферы жыллёвай нерухомасці дзейнічаюць свае рынкавыя законы. На сталічным рынку існуе пэўная крытычная і неабходная колькасць здзелак куплі-продажу кватэр, якія будуць ажыццяўляцца абавязкова. Скасоўваюцца шлюбы, калі трэба шукаць дадатковае жыллё, набываюць новыя кватэры маладыя сем'і, купляюць кватэры пры змене месца працы і г.д. Рынак жылля жывы, і спыніць рух кватэр немагчыма.

Паводле пэўных падлікаў, у такім буйным горадзе, як Мінск, неабходна ажыццяўляць каля 15 тысяч здзелак у год. Гэта мінімум. Раней здзелкі фіксаваліся амаль у аднолькавых аб'ёмах і на першасным, і на другасным рынках жылля сталіцы. Калі першасны рынак забуксуе, то кліенты пачнуць плаўна больш звяртаць увагі на рынак ужо немаладых кватэр. Атрымліваецца, што попыт на жыллё на другасным рынку можа павялічыцца. Зараз наконт цэн. Эканамічныя законы сведчаць аб тым, што пры істотнай дэвальвацыі нацвалюты цэны ў доларах на нерухомасць памяншаюцца. Справа ў тым, як моцна кватэры ў доларах будуць таннець?

Спадар Астапеня ўпэўнены, што ў сезон максімальнага попыту да сярэдзіны снежня кошт квадратнага метра жылля стандартных кватэр знізіцца не больш чым на 1—2 працэнты.



## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в агрогородке Драчково Драчковского сельсовета, Смолевичского района, Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | **30 ноября 2011 года, в 15.00, аг. Драчково, ул. Центральная, д. 19 «В», Драчковский сельисполком, кабинет председателя** |
| 3 | Продавец и его адрес | Драчковский сельский исполнительный комитет, аг. Драчково, ул. Центральная, д. 19 «В» Смолевичского района Минской области |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – земельный участок площадью 0,1500 га (по генплану № 50) с кадастровым № 624880802101000470 в аг. Драчково, ул. Солнечная;<br>Лот № 2 – земельный участок площадью 0,1500 га (по генплану № 4 с кадастровым № 624880802101000478 в аг. Драчково, ул. Гомельская;<br>Лот № 3 – земельный участок площадью 0,1500 га (по генплану № 19 с кадастровым № 624880802101000436 в аг. Драчково, ул. Гомельская;<br>Лот № 4 – земельный участок площадью 0,1500 га (по генплану № 21 с кадастровым № 624880802101000459 в аг. Драчково, ул. Гомельская;<br>Лот № 5 – земельный участок площадью 0,1499 га (по генплану № 23 с кадастровым № 624880802101000456 в аг. Драчково, ул. Гомельская. |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 – 51 834 182 рублей<br>Лот № 2 – 57 017 601 рубль<br>Лот № 3 – 24 920 280 рублей<br>Лот № 4 – 24 920 280 рублей<br>Лот № 5 – 24 903 693 рубля |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1 – газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение.<br>Лот № 2 – газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение, подъездная асфальтированная дорога;<br>Лот № 3, лот № 4 и лот № 5 – электроснабжение. |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3604627010006 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, УНП 600046589, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждую среду с 13.00 до 14.00 |
| 13 | Окончательный срок приема документов | 24 ноября 2011 года в 17.00 |
| 14 | Контактные телефоны | 8 01776 48 4 23, 48 4 24, 48 4 73 |
| 15 | Дополнительные сведения | Земельные участки расположены вблизи леса и на расстоянии 7 км от Петровичского водохранилища |

**Расходы по организации и проведению аукциона** (лот №1, № 2, № 3, № 4, № 5 – по 84 000 рублей за каждый) **и затраты на публикацию информационного сообщения в размере 1 031 520 бел. руб. подлежат возмещению победителем аукциона**.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ на «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения по ул. Курганная в г. Минске»

**Информация о застройщике:**

Застройщик: Иностранное частное торгово-строительное унитарное предприятие «ГЕРБЕЛИНВЕСТ», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от «26» сентября 2008 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191068402.

**Адрес:** 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Димитрова, 5, пом. 1.

**Режим работы:** пн.–пт. с 9.00 до 18.00, перерыв с 13.00 до 14.00.

**Телефоны:** (017) 203 32 78, (017) 203 38 49, Факс: (017) 306 24 52.

До настоящего проекта организация не осуществляла функции застройщика жилых домов и иных объектов недвижимости.

**Информация о проекте строительства:** Застройка трех домов.

Цель проекта строительства — строительство трех 7-9-этажных многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного и административного назначения по генплану:

- 1-я очередь строительства – блок-секции GI-3223-7-Л, GI-21112-8-С, GI-21112-9П;
- 2-я очередь строительства – блок-секции GI-3223-7-Л, GI-21112-8-С, GI-21112-9П;
- 3-я очередь строительства – блок-секции GI-3223-7-Л, GI-21112-8-С, GI-21112-9П;

Здание каждого многоквартирного жилого дома запроектировано из 3-х секций, общая площадь жилого здания 6924,29 м$^2$, из них жилых помещений (квартир) — 6039,47 м$^2$. Количество жилых помещений (квартир) — 108, из них: однокомнатных — 47, двухкомнатных — 45, трехкомнатных — 15, четырехкомнатных — 1. Каждая секция оборудована мусоропроводом, одним грузопассажирскими лифтом. Во всех квартирах предусмотрены летние помещения (остекленные лоджии). Конструкция здания — сборные железобетонные конструкции с эффективным минераловатным утеплителем. Высота этажа – 3 м.

Объект долевого строительства расположен в г. Минске в границах ул. Курганная – ул. Космонавтов, с севера – вдоль лесопарковой зоны по проектируемой улице № 1, с запада и юга существующей усадебной застройкой по ул. Курганной, с востока существующей жилой застройкой по ул. Космонавтов.

Начало строительства — октябрь 2010 г.

Ориентировочные сроки окончания строительства жилых домов 1, 2, 3 очереди — 1-й квартал 2012 г.

**Застройщиком получены:**

- экспертное заключение Государственного комитета по стандартизации Республики Беларусь (РУП «Главгосстройэкспертиза») от 05.10.2010 г. № 1173–15/10, от 07.10.2010 г. № 1454-15/10И, от 16.12.2010 № 1622-15/10;
- решение Минского городского исполнительного комитета от 08.10.2010 г. № 2320 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешения строительства»;
- разрешение специализированной Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску на производство строительно-монтажных работ № 2-203Ж-067/10 от 11.10.2010, 05.11.2010, 28.12.2010, 27.01.2011.

Застройщику на праве временного пользования на период строительства выделены земельные участки площадью 3,2181 га (свидетельство о государственной регистрации № 500/986-3352) и 0,0051 га (свидетельство о государственной регистрации № 500/986-3351).

Генеральный подрядчик СООО «МБКмонолитстрой».

Заключение договоров создания объектов долевого строительства будет проводиться поэтапно.

Для физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей предлагаются к заключению по договорам создания объектов долевого строительства 15 (пятнадцать) квартир (однокомнатные, двухкомнатные, трехкомнатные, общей площадью от 34,56 м$^2$ до 82,02 м$^2$).

Стоимость одного метра квадратного жилых помещений эквивалентна 1020 (одна тысяча двадцать) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь. Стоимость неизменна до окончания строительства. Указанная в настоящей проектной декларации цена за 1 м$^2$ общей площади по проекту соответствующих квартир и их количество считается действительным до момента опубликования новой декларации.

Уплата цены договора производится дольщиком единовременно в установленный договором период по графику платежей, который является неотъемлемой частью договора (п.9 Правил заключения, исполнения и расторжения договора создания долевого строительства, утвержденных Указом Президента Республики Беларусь от 15.07.2006 г. № 396).

**Работы по внутренней отделке жилых помещений, выполняемые Застройщиком:**

- бетонная подготовка под укладку полов, гидроизоляция полов в санузлах без окраски стен и потолков;
- электроснабжение – поквартирная разводка электропроводки с установкой розеток, электросчетчиков и выводом на кухне для подключения электроплиты;
- вентиляция – естественная;
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета, установка и подключение унитаза, выводы для кухни и ванны;
- канализация – стояки с поквартирной разводкой трубопроводов к точкам подключения;
- отопление – водяное;
- телефонизация, радиофикация, телевидение – поквартирная разводка.

**Внутренняя отделка мест общего пользования:** общие коридоры, лифтовые, лестничные пролеты, входные группы, технические помещения.

Иные работы по внутренней отделке Застройщиком не выполняются, в том числе не устанавливаются внутренние дверные блоки, а также не производится чистовая отделка помещений.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые, вентиляционные и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания. Данное имущество поступает в общую собственность дольщиков, если финансирование этих объектов производилось дольщиками, и передаются Застройщиком по акту приемки передачи представителю товарищества собственников, если на момент ввода дома в эксплуатацию это товарищество создано. В случае если такое товарищество не создано, лицу, определяемому общим собранием Дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

После выполнения строительно-монтажных работ на прилегающей территории жилого дома будет выполнено благоустройство и озеленение согласно утвержденного генерального плана.

Срок действия настоящей проектной декларации — до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованных ранее.

**Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить в уполномоченной риэлтерской организации ООО «РиэлтХаус», лиц. № 02240/225, 18.05.2011-16 Минюст Республики Беларусь, риэлт. услуги. УНП 191441618 по адресу: г. Минск, ул. Димитрова, д. 5, оф. 21, тел.: (017) 306 08 20, (029) 504 08 20, адрес в интернете: www.kurgannaya.by.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревнях Емельяново, Узбережье Усяжского сельского исполнительного комитета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | **30 ноября 2011 года в 15.00, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10, Усяжский сельисполком, кабинет председателя** |
| 3 | Продавец и его адрес | Усяжский сельский исполнительный комитет, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – земельный участок площадью 0,1500 га № 624885602601000103 в д. Емельяново;<br>Лот № 2 – земельный участок площадью 0,1997 га № 624885606101000006 в д. Узбережье;<br>Лот № 3 – земельный участок площадью 0,1997 га № 624885606101000007 в д. Узбережье |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | Начальная (стартовая) цена | Лот № 1 – 22 663 368 рублей<br>Лот № 2 – 11 167 324 рубля<br>Лот № 3 – 11 167 324 рубля |
| 8 | Условия аукциона | - продажа по цене не ниже начальной;<br>- участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | д. Емельяново – газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение;<br>д. Узбережье – электроснабжение |
| 10 | Условия оплаты | Безналичный расчет в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с 3604627110007 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок) |
| 12 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждая среда в 10.00 |
| 13 | Окончательный срок приема документов | 24 ноября 2011 года в 17.00 |
| 14 | Контактные телефоны | 8 (01776) 67 131, 67 2 88; 55 342 |

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

26
КАСТРЫЧНІКА 2011 г. СЕРАДА № 31 (15682)
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ЧУО «Институт предпринимательской деятельности» ПРИГЛАШАЕТ НА КУРСЫ ПО ПОДГОТОВКЕ К ЦЕНТРАЛИЗОВАННОМУ ТЕСТИРОВАНИЮ 2012 года ПО ПРЕДМЕТАМ:
- МАТЕМАТИКА;
- РУССКИЙ/ БЕЛОРУССКИЙ ЯЗЫКИ;
- ИНОСТРАННЫЕ ЯЗЫКИ;
- ИСТОРИЯ БЕЛАРУСИ.

Запись проводится по адресу: **ул. Серафимовича, 11, комн. 607.**
**ПРОЕЗД:** ст. метро «Пролетарская» (от метро 60 м).
**Троллейбусы** №№ 3, 16, 30, 36, 59 до ост. «Кинотеатр «Ракета».
**Автобусы** №№ 18, 37, 57, 59.
Сроки обучения: 8, 7, 6, 5 месяцев.
**СПРАВКИ ПО ТЕЛ.: 247 08 77, 247 06 22.**
УНП 101357946

Бізнэс-шоу

## Куцюр'е з Грузіі:

# «У ВАШЫХ ДЫЗАЙНЕРАЎ НЕ ХАПАЕ СМЕЛАСЦІ»

## Чым парадаваў Belarus Fashion Week сезона вясна-лета 2012?



Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**АДРОЗНІЦЬ туфлі-оксфарды ад туфляў-дэрбі могуць не ўсе. Мы сотні разоў бачылі блэйзер, але калі нас завесці ў краму і папрасіць паказаць яго, можам і разгубіцца. Паяднаць беларусаў з модай чарговы раз паспрабавалі арганізатары Тыдня моды ў Беларусі — у беларускай сталіцы прайшоў Belarus Fashion Week.**

Магчымасць «выгуляць» новыя сукенкі і сумачкі з'явілася і ў беларускіх селебрыці. Такая шчыльная канцэнтрацыя зорак на квадратны метр выклікала ўвагу ў абывацеля, які мог з цікавасцю разглядаць кофтачку Вольгі Барабаншчыкавай або джынсы бойфрэнда чарговай зорнай бландзінкі.

Самі «багатыя і вядомыя» трымаліся натуральна і проста — разам з усімі тоўпіліся ў павільёне і чакалі, пакуль у залу пачнуць нарэшце пускаць гасцей. Час ад часу ў душным паветры адчуваўся пах духоў і дарагіх адэкалонаў. Публіка збольшага была юнай, але тым не менш ужо дастаткова «прасунутай» у тэме моды і стылю. Стракатасць сукенак і касцюмаў (часта сапраўды падабраных з густам), сведчыла аб тым, што моднікаў у Мінску шмат.

Сярод дзяўчат мадэльнай знешнасці і хлопцаў-метрасэксуалаў, якія прыходзілі на паказы, асабліва вылучаліся немаладыя госці. І калі жанчыны, шчабечучы адна з адной, адчувалі сябе ўпэўнена, то іх спадарожнікі — мужчыны за 40 — чуліся трохі ніякавата. Напрыклад, пасля фінішнага паказу Івана Айплатава, які закрываў фэшн-падзею, жанчыны яго калекцыю хвалілі, а іх спадарожнікі бойка абмяркоўвалі татуіраванае цела аднаго з хлопцаў-мадэляў...

### «Мужчыны не павінны баяцца эпаціраваць»

Восеньскі Тыдзень моды ў Беларусі прадставіў публіцы калекцыі адзінаццаці беларускіх дызайнераў (сярод найбольш вядомых — IVAN AIPLATOV, YULIA LATUSHKINA, BOITSIK, TARAKANOVA і інш.). Сярод гасцей — калекцыі з Турцыі (MASGALLI), Украіны (SANATAN), Расіі (TANYA ARZHANOVA) і Грузіі (TINATIN MAGALASHVILI).

У другі раз арганізатары Belarus Fashion Week арганізавалі адукацыйны цэнтр Fashion Study. На лекцыі вядомых іміджмейкераў, стылістаў, журналістаў і дызайнераў мог патрапіць кожны ахвотны. Новаўвядзеннем стаў і адмысловы Шоу-рум — павільён з выстаўкай дызайнерскага адзення, абутку і аксесуараў.

— Я звярнула ўвагу на мужчынскія калекцыі і магу смела сказаць: гэта якраз тое, што патрэбна нашым мужчынам, — прызнаецца грузінка Ціна Магалашвілі (марка TINATIN MAGALASHVILI). — У Грузіі мужчынскае адзенне вырабляюць пераважна для Еўропы, самих жа грузінаў тое адзенне не надта прываблівае. Што датычыць у цэлым беларускай моды, то ў мяне склалася ўражанне, што ў вашых дызайнераў не хапае смеласці здзяйсняць штосьці шалёнае. Патрэбнасць у гэтым ёсць — дэфіцыт чагосьці новага і свежага адчуваецца.

Украінскі дызайнер Sanatan спецыяльна для Belarus Fashion Week падрыхтаваў калекцыю «Палёт за гарызонт». Мужчынскія і жаночыя мадэлі здзіўлялі найперш буянствам фарбаў. І калі на дзяўчатах гэта глядзелася прывычна, то мужчыны ў чырвоных і фіялетавых штанах выглядалі правакацыйна і надзвычай смела.

— Колькі можна хадзіць мужчынам у чорна-белых касцюмах?! Трэба вучыцца глядзець шырэй, — упэўнены Sanatan, які да журналістаў выйшаў у перламутравай кашулі з гузікамі, вырабленымі з ракушак. — Мы хацелі, каб у гэтай калекцыі мужчынскія мадэлі вызначаліся — такі драпежны крой з яркімі колерамі.

— Мужчыны не павінны баяцца эпаціраваць, — дадае ўкраінскі піяр-менеджар дызайнера Ганна Варанцова.





Абмяркоўваючы фасоны адзення, нельга не спыніцца на самых мадэлях, якія іх дэманструюць. Хоць на восеньскім Fashion Week не было заўважана вядомых Любові Яковінай і Таццяны Рынейскай, звярнулі на сябе ўвагу вопытныя мадэлі з «Млына моды». Як вядома, Саша Варламаў быў супраць удзелу сваіх мадэляў у Belarus Fashion Week. Аднак сёння, калі кіраўніком «Млына моды» стала Алена Запёкіна, сітуацыя змянілася.

Калі з выбарам мадэляў-дзяўчат цяжкасцяў не ўзнікала, то мадэляў-мужчын у Беларусі яўны дэфіцыт. Асабліва дзіўна было назіраць за шыкоўнай калекцыяй турэцкага брэнда MASGALLI, разлічанай на мужчын за 35, якую дэманстравалі хударлявыя юнакі 20-22 гадоў...

**Belarus Fashion Week карысны хоць бы тым, што дапамагае дызайнерам сачыць за інтэрпрэтацыяй моды. Беларускія куцюр'е могуць параўнаць сваё з чужым. Трэці сезон тыдня моды ў Беларусі — сур'ёзная заяўка на тое, каб стаць сапраўды традыцыйнай падзеяй.**

**Застаецца толькі падцягнуць арганізацыю — святло для фатографаў, кава-аўтаматы для мадэляў ці хоць бы самае элементарнае — усталяваць прыбіральню, якая б працавала на працягу ўсяго Тыдня, а не толькі ў апошнія яго дні. Інакш паказы застануцца без гледачоў. А каму патрэбна непабачаная мода?**

**Ілья ЛАПАТО.**

### PRO I CONTRA

**ІНА АФАНАСЬЕВА, СПЯВАЧКА:**

— У мяне няма ніякай кароны на галаве, але я лічу, што ў арганізатараў павінна быць пачуццё павагі да запрошаных гасцей. Мяне запрасілі, я прыйшла з кветкамі, але ў выніку проста вярнулася дадому. Я лічу, што я не павінна бегаць па зале і шукаць месца. Гэта пры тым, што спачатку трэба гадзіну адстаяць у натоўпе і духаце. У нас не ўмеюць рабіць прыгожа і добра. Гэта было маё апошняе наведванне падобных мерапрыемстваў. З гэтага часу глядзець на моду я буду лепш у іншых месцах: Кіеў, Мілан і г.д.

**ЦІНА МАГАЛАШВІЛІ, ДЫЗАЙНЕР З ГРУЗІІ:**

— Я прадумвала калекцыю з улікам таго, што пакажу яе ў Беларусі. І мне ў вас вельмі спадабалася. Мы прабегліся па крамах і ў захапленні ад беларускага тэкстылю — ён нашмат лепшы па якасці за турэцкі, таму было б проста цудоўна, калі б у Грузіі адкрыўся магазін беларускага трыкатажу.

ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ - 2011

*Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны і яе філіялы на базе дзяржаўных Рэчыцкага і Пінскага аграрных каледжаў*

З 1 па 30 лістапада ПРЫМАЮЦЬ ДАКУМЕНТЫ НА ЗАВОЧНУЮ ФОРМУ НАВУЧАННЯ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:
- ВЕТЭРЫНАРНАЯ МЕДЫЦЫНА;
- ЗААТЭХНІЯ – поўны і скарочаны тэрміны навучання;
- ДЗЯРЖАЎНАЕ КІРАВАННЕ І ЭКАНОМІКА.

Уступныя іспыты з 1 па 20 снежня.

Для абітурыентаў з 21 па 30 лістапада арганізуюцца курсы па падрыхтоўцы да экзаменаў па беларускай (рускай) мовах, хіміі і біялогіі.

Даведкі па тэлефонах: **Віцебск** (80212) 37 23 22, 35 99 66, **Рэчыца** (802340) 24 0 42, **Пінск** (80165) 30 31 81.

УНН 300002681

ВЫ МОЖЕТЕ ЕЩЁ СТАТЬ СТУДЕНТОМ.
Продолжается приём на заочную форму обучения.

ОБРАЗОВАНИЕ
УНН 191170822
- ВЫСШЕЕ
- ВТОРОЕ ВЫСШЕЕ

- юриспруденция (специализации: гражданско-правовая, уголовно-правовая);
- финансы и кредит.

- Заочная и дистанционная формы обучения;
- Сроки обучения:
  - **3 года** на базе среднего специального профильного (техникум, колледж) и высшего образования *(вступительные испытания – собеседование в ВУЗе);*
  - **5 лет** на базе среднего образования *(вступительные испытания – тестирование в ВУЗе);*
- Обеспечение студентов-заочников общежитием;
- Выпускники ВУЗов получают **ГОСУДАРСТВЕННЫЕ ДИПЛОМЫ;**
- Ближайшие потоки: до 25 ноября.



О порядке поступления и обучения – официально в «ВПО ПРОФКОНСУЛЬТАНТ», 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, д. 20 «А»,
тел.: (017) 200-82-57, 200-63-51
GSM: (029) 509-82-57, (044) 709-82-57
www.vpo.by
Свидетельство о государственной регистрации № 191170822 от 26.05.2009 г. Мингорисполкома.

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС

## Дырэктар Лоеўскага КБМ Валерый ЯСТРЭМСКІ:

# «ЭЛІТНАЕ ЖЫЛЛЁ БУДУЕЦЦА З ЦЭГЛЫ!»



Дырэктар Валерый ЯСТРЭМСКІ.

***На пляцоўцы перад вытворчым цэхам Лоеўскага камбіната будаўнічых матэрыялаў цэгла, акуратна ўпакаваная ў цэлафан, не затрымліваецца і гадзіны пасля вырабу. Яе адразу ж забіраюць спажыўцы, якія прыязджаюць па будаўнічы матэрыял дакладна па графіку. Вось і ў момант, калі мы пад'ехалі, чарговую партыю грузілі на вялізны аўтамабіль, а ўсмешлівы машыніст крана Вольга Арцёменка давала каманду «Віра» сваёй калезе Наталлі Марцянюк.***





Вытворчы цэх.



Аператар Аляксандр СІМУТКІН за працай.

Між іншым, сучаснае прадпрыемства на гэтым месцы ўзнікла зусім нядаўна — у 2008 годзе, у адпаведнасці з рэалізацыяй Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў і паводле Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб будаўніцтве камбіната будаўнічых матэрыялаў у пасёлку гарадскога тыпу Лоеве». Зроблена гэта было ў мэтах больш поўнага выкарыстання прыродных сыравінных рэсурсаў Гомельскай вобласці, развіцця прамысловага патэнцыялу Лоева.

Мэтазгоднасць будаўніцтва камбіната была абумоўлена наяўнасцю на тэрыторыі Лоеўскага раёна буйных радовішчаў глін («Крупейскі сад» і «Нікалаеўка»), сукупныя запасы якіх складаюць каля 1,5 млн куб.м і могуць забяспечыць яго працу надоўга. Па ацэнках спецыялістаў, з гэтай сыравіны можна вырабляць першакласную будаўнічую цэглу, нават абліцовачную. Акрамя таго, на камбінаце створана 195 працоўных месцаў.



Намеснік дырэктара Лідзія ДОЛБІКАВА.

Вытворчасць камбіната разлічана на выпуск будаўнічай керамічнай цэглы і цагляных сценавых вырабаў з гліны. Яе магутнасць — 20 млн штук умоўнай цэглы ў год. Гэты матэрыял можна выкарыстоўваць для будаўніцтва падмуркаў, сцен, перагародак у вышынных будынках, для муру печак, у тым ліку ў вільготных памяшканнях і агрэсіўных асяроддзях. Па ацэнках спецыялістаў, цэгла, якая вырабляецца на прадпрыемстве, — адна з лепшых у краіне па сваіх якасных характарыстыках.

Усе сістэмы канвеераў, сушыльнае аддзяленне, печ абпалу і іншае абсталяванне выраблены на айчынных прадпрыемствах, а камплектаваў тэхналагічную лінію камбіната магілёўскі навукова-тэхнічны цэнтр «Строммаш». Абсталяванне працуе ў аўтаматычным рэжыме. Тут паўсюдна запатрабавана высокакваліфікаваная праца. Таму большасць супрацоўнікаў асвоіла інтэлектуальную дзейнасць: усе тэхналагічныя працэсы кантралююць камп'ютары.

— Зусім іншыя ўмовы працы, чым на прадпрыемствах папярэдняга пакалення, — адзначае дырэктар Валерый Ястрэмскі. — Людзі за гэты час зразумелі, што можна жыць у невялікіх гарадах і на высокім узроўні валодаць самымі сучаснымі ведамі і тэхналогіямі. Сёння на рынку запатрабавана паўнацелая цэгла, хоць камбінат і быў запраектаваны на пустацелую. А гэта іншая тэхналогія, якая патрабуе больш часу на сушку. І таму мы сёння выпускаем 14-15 млн штук у год, а не 20, як было запланавана. Наша цэгла сёння найбольш запатрабавана будаўнічымі арганізацыямі Гомельскай вобласці. Яна ідзе на бюджэтнае будаўніцтва жылля, якое звычайна ажыццяўляецца па льготных крэдытах. Цяпер мы прапрацоўваем магчымасці экспарту нашай цэглы ў бліжэйшыя рэгіёны Расіі. Аптовая адпускная цана, як і якасць прадукцыі, патэнцыяльных пакупнікоў задавальняе, а вось дастаўка — не: яна вельмі дарагая. Я спадзяюся, што знойдзем пагадненне з суседзямі і зможам мець дадатковыя грашовыя сродкі і неабходны прыбытак.

— Разлічвалі, што наш камбінат акупіцца праз 12 гадоў, — працягвае намеснік дырэктара па эканоміцы, фінансавых пытаннях і маркетынгу Лідзія Долбікава. — Аднак ужо сёння мы выйшлі на бясстратную працу. Калі летась на такую дату ў нас было 1,5 млрд рублёў страт, сёлета ёсць хоць невялікі, але прыбытак. Прадпрыемства ўжо выйшла на дадатную рэнтабельнасць ад продажу прадукцыі. Самае галоўнае — ніводны спажывец не адмовіўся ад нашай прадукцыі. Вядома, мы б хацелі, каб нас не абмяжоўвалі ў фарміраванні цаны — мы самі маглі б пралічваць рынак: па якой цане пойдзе наша прадукцыя. У некаторым сэнсе адмоўна паўплываў на нашы паказчыкі валютны крызіс, бо ў нас выкарыстоўваецца шмат камплектуючых імпартнай вытворчасці. Таксама даражэюць сыравіна і транспартныя перавозкі. А цану нам зацвярджаюць са спазненнем на месяц. Калі б справы ішлі так, як на пачатку года, паказчыкі, безумоўна, былі б лепшымі.

*Натуральны колер керамічнай цэглы вар'іруецца ад светла-чырвонага да карычневага. Збудаванні з цэглы маюць прывабны выгляд, і іх неабавязкова тынкаваць ці пакрываць абліцовачным матэрыялам. Такім чынам значна змяншаецца сабекошт мура.*



Абпальвальшчык Іван АРЦЁМЕНКА на пункце кіравання працэсамі абпальвання і сушкі.

*Выкарыстанне цэглы ў спалучэнні з рознымі іншымі матэрыяламі дазваляе дызайнерам і архітэктарам ствараць арыгінальныя праекты. Цэгла забяспечвае надзейную абарону ад уздзеяння вонкавых фактараў, валодае высокай вогнеўстойлівасцю і нізкай цеплаправоднасцю, забяспечвае высокі ўзровень камфорту і жылых, і прамысловых будынкаў.*

Тым не менш тут, на Лоеўскім камбінаце будаўнічых матэрыялаў, да канца года плануюць завяршыць рэалізацыю інвестыцыйнага праекта па мадэрнізацыі сушыльнага аддзялення з мэтай павелічэння аб'ёму выпуску цэглы. Праектам прадугледжана павелічэнне магутнасці сушыльнага абсталявання. Фінансаванне работ на гэтым этапе ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту.

— Мадэрнізацыя неабходна, каб пашырыць вытворчасць менавіта паўнацелай цэглы, попыт на якую ў Гомельскай вобласці вялікі, — адзначае дырэктар Валерый Ястрэмскі. — Пераход на вытворчасць толькі паўнацелай цэглы з захаваннем запланаваных аб'ёмаў і запатрабаваў павелічэння магутнасці сушыльнага абсталявання. Зараз мы поўнасцю замянілі сістэму вентыляцыі цэха. На чарзе сушыльнае аддзяленне. І яшчэ трэба зрабіць укрыцце пад гліназапаснікам. Між іншым, павелічэнне аб'ёмаў выпуску сваёй прадукцыі мы зробім без павелічэння колькасці работнікаў. Значыць, у нас з'явяцца дадатковыя сродкі для развіцця вытворчасці. У наш час прадпрыемства закрывае да 30% патрэб вобласці ў керамічнай цэгле. У наступным годзе плануем пачаць вырабляць і спецыяльную цэглу для абліцоўкі фасадаў. Сыравіна тут добрая, цэгла павінна прыгожай атрымацца!



Аператар Аляксандр ДЗЕГЦЯРЭНКА на пульце кіравання працэсам упакоўкі цэглы

Павел Дылько на камбінаце працуе трэці год — размеркаваўся пасля заканчэння Мінскага тэхналагічнага ўніверсітэта. За кароткі час паспеў зрабіць кар'еру ад звычайнага інжынера да пасады галоўнага тэхнолага. Сам родам з Брэсцкай вобласці, але тут ён атрымаў жыллё, і работа прыйшлася па душы:

— Сама праца цікавая, і кожны раз адкрываю для сябе нешта новае і карыснае, — гаворыць малады спецыяліст.

На прадпрыемстве дзейнічае сертыфікаваная выпрабавальная лабараторыя. Акрамя таго, усе вырабы праходзяць строгі радыяцыйны кантроль. Уся прадукцыя Лоеўскага камбіната будаўнічых матэрыялаў прайшла сертыфікацыйныя выпрабаванні ва УП «Навукова-даследчы інстытут будаўнічых матэрыялаў» (Рэспубліка Беларусь), па выніках якіх атрымала сертыфікат адпаведнасці. Ён сведчыць, што сістэма менеджменту якасці вытворчасці цэглы адпавядае патрабаванням СТБ ISO 9001-2009. Прынамсі, па выніках рэспубліканскага прафесійнага конкурсу цэгла СТБ 1160-99 М150 F75 і СТБ 1160-99 М200 F75 атрымалі дыпломы як «Лепшыя будаўнічыя прадукты года-2011».



Упакоўка гатовай прадукцыі.

Па якасці Лоеўская цэгла здольная канкурыраваць з аналагічнай прадукцыяй іншых прадпрыемстваў Беларусі. У бліжэйшых планах кіраўнікоў прадпрыемства — засваенне вытворчасці клінкернай цэглы. Прынамсі, з такой цэглы складзена Крамлёўская сцяна ў Маскве. Між іншым, спробы вырабляць прыгожы і каштоўны матэрыял на камбінаце ўжо рабіліся:

— Кераміка — самы лепшы матэрыял для жылля, — падкрэслівае дырэктар Лоеўскага камбіната будаўнічых матэрыялаў Валерый Ястрэмскі. — Элітнае жыллё звычайна будуецца менавіта з цэглы. У доме з керамічнай цэглы камфортна: узімку — цёпла, улетку — прахаладзь, у любую пару года дыхаецца лёгка. Керамічная цэгла валодае выдатнай гука- і цеплаізаляцыяй, забяспечвае натуральную цыркуляцыю паветра і нават чысціць яго. Справа ў сыравіне: гліна даўно вядомая як экалагічна чыстая і нават «гаючы» матэрыял.



Машыніст крана Вольга АРЦЁМЕНКА дае каманду на пагрузку цэглы.



Галоўны тэхнолаг Павел ДЫЛЬКО правярае якасць прадукцыі.

**НАШ АДРАС:**
**247095, Гомельская вобласць, г.п. Лоеў, вул. Камсамольская, д. 35. тэл./факс 8-02347-42217**
УНН 400028294

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Алена ДАЎЖАНОК.**

# «БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ — ГЭТА НАЦЫЯНАЛЬНЫ БРЭНД»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Дазволю сабе прывесці некалькі цытат з вашай кнігі: «Майму пакаленню давялося жыць у няпросты час. Давялося вучыцца жыць у маленькай дзяржаве падчас глыбокага крызісу. Па прычыне недахопу фінансавання ў 90-я гады з інстытута пачалі сыходзіць моцныя кадры. У мяне не вытрымала сэрца, і я таксама стаў шукаць працу за мяжой...». На шчасце, для Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук, які вам давялося ўзначальваць не адзін год, а цяпер і для Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, вы ўсё ж зрабілі свой выбар на карысць работы на радзіме. Але многія маладыя людзі (і студэнты, і маладыя навукоўцы) па-ранейшаму нацэлены на Захад. Як, на вашу думку, можна ўтрымаць на радзіме беларускую моладзь, асабліва ў свеце будучага далучэння нашай краіны да Балонскага працэсу?***

— Далучэнне да Балонскага працэсу нічога кардынальна не зменіць. Для маладых людзей і сёння не існуе ніякіх бар'ераў у плане наведвання замежных канферэнцый, сімпозіумаў, стажыровак ці працаўладкавання за мяжой, асабліва ў такіх галінах, як інфарматыка, матэматыка, фізіка, хімія, біялогія. Не першы год мы ўдзельнічаем у праграмах студэнцкіх абменаў. У нас заключаны дагаворы з мноствам замежных універсітэтаў. Нашы матэматыкі і інфарматыкі запатрабаваны ва ўсім свеце. Я неадноічы быў сведкам, з якім задавальненнем бяруць нашых выпускнікоў у сваю магістратуру і аспірантуру замежныя універсітэты, паколькі падрыхтоўка па матэматычных і прыродазнаўчых дысцыплінах у БДУ — выдатная.

А міграцыя навуковых кадраў заўсёды існавала і будзе існаваць. Гэта праблема актуальная для ўсіх краін, а не толькі для постсавецкай прасторы. Тыя ж немцы скардзяцца, што іх навукоўцы выязджаюць у ЗША. Шчыра скажу, што, параўноўваючы лёс тых, хто паехаў у 90-я гады працаваць за мяжу, і тых, хто застаўся на радзіме, я не магу адназначна сказаць, хто з іх выйграў, а хто прайграў. Я ведаю шмат людзей, якія паехалі на Захад, але не змаглі там рэалізаваць сябе. Таму студэнтаў я заўсёды папярэджваю, што вельмі цяжка і адзінока жыць у чужой краіне. І падняцца па службовай лесвіцы там таксама зусім не проста. Мой досвед сведчыць, што значна прасцей гэта зрабіць на радзіме. Таму думайце, думайце і яшчэ раз думайце, перш чым прыняць такое важнае рашэнне ў сваім жыцці. Хачу дадаць, што калі ў 90-я гады мы назіралі адток навуковых кадраў, то пазней пачаўся зваротны працэс. У Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі і ў Белдзяржуніверсітэт пачалі вяртацца нашы маладыя людзі, якія не адзін год працавалі на Захадзе. Гэты год, вядома, складаны для ўсіх, аднак я ўпэўнены, што ўсе праблемы — часовыя, а таму не трэба рабіць ніякіх рэзкіх крокаў.

Безумоўна, каб утрымаць на радзіме таленавітую моладзь, трэба ствараць для маладых навукоўцаў умовы для занятку любімай работай, іх праца павінна годна аплачвацца, яны павінны мець магчымасць пабудаваць сабе жыллё. І я хачу сказаць, што Белдзяржуніверсітэт шмат робіць у гэтым напрамку. Навуковая творчасць студэнтаў не толькі вітаецца ў нас, але і ўсяляк заахвочваецца. У прыватнасці, у БДУ рэгулярна праводзіцца конкурс грантаў на выкананне навуковых даследаванняў студэнтаў і аспірантаў. Сёлета ўніверсітэт выдаткаваў 117 мільёнаў рублёў на падтрымку лепшых праектаў студэнтаў і аспірантаў. Па выніках конкурсу на лепшую студэнцкую навукова-даследчую лабараторыю ў гэтым годзе было прэміравана 16 навуковых кіраўнікоў і 49 удзельнікаў лабараторый (памер прэміі кіраўніку вагаўся ад 885 тысяч да 2 млн 950 тысяч рублёў). Па выніках конкурсу на лепшага кіраўніка і арганізатара навукова-даследчых работ студэнтаў і аспірантаў было прэміравана 20 выкладчыкаў: памер прэмій — ад 525 тысяч да 1 млн 750 тысяч рублёў. На фінансаванне камандзіровак студэнтаў на навуковыя канферэнцыі было выдзелена 7 мільёнаў рублёў з уласных сродкаў. Да таго ж сёлета быў пабудаваны дом на 117 кватэр для маладых выкладчыкаў — з дзяржаўнай падтрымкай, па льготных цэнах.

***— За два апошнія гады БДУ прасунуўся ў сусветным рэйтынгу Webometrics на 700 пазіцый і займае там сёння 1208-ю прыступку. Наколькі мне вядома, Webometrics ранжыруе прысутнасць ВНУ ў сусветным павуцінні. Не маглі б вы патлумачыць, якая карысць БДУ ад яго прысутнасці ў тым ці іншым сусветным рэйтынгу?***

— Адукацыя — гэта сур'ёзны рынак, дзе ёсць мноства гульцоў. Таму пападанне ў рэйтынгі прэстыжна для любой ВНУ, бо за імі сочыць сусветная супольнасць. Розныя агенцтвы пры складанні рэйтынгаў карыстаюцца рознымі крытэрыямі, не заўсёды празрыстымі і зразумелымі для нас, але факт застаецца фактам: часцей за ўсё ў сусветных рэйтынгах фігуруюць ВНУ англамоўнай прасторы. У адрозненне ад многіх іншых міжнародных рэйтынгаў, праект Webometrics ацэньвае, так бы мовіць, «бачнасць» ВНУ ў інтэрнэт-прасторы. За кошт тэхналагізацыі працэдуры складання рэйтынгу даследчая група ахоплівае каля 20 тысяч ВНУ і паказвае затым усе вынікі на сваім сайце.

> **Калі мы нацэлены на пашырэнне экспарту адукацыйных паслуг, то ігнараваць інтэрнэт-рэсурс проста недаравальна.**

Так, у апошнім рэйтынгу была прадстаўлена інфармацыя пра 12 тысяч ВНУ. Рэйтынг Webometrics не толькі факусіруе ўвагу на выніках навуковай дзейнасці, але і паказвае глабальныя працэсы развіцця навуковых школ, даследчых інстытутаў і ўніверсітэтаў. Ён больш маштабны, чым «шанхайскі» ці «таймсаўскі», таму карціна развіцця сусветных універсітэтаў, заснаваная на вэб-індыкатарах, аказваецца больш адэкватнай рэчаіснасці. Гэта самы поўны аналіз дзейнасці ВНУ, незалежна ад іх знаходжання на сусветнай карце. Рэйтынг публікуецца два разы на год і адлюстроўвае ўсе дастаткова сур'ёзныя змяненні па прасоўванні дзейнасці ВНУ ў віртуальнай прасторы.

Яшчэ ў 2009 годзе мы прынялі рашэнне, што прысутнасць БДУ ў такім рэйтынгу будзе карысная. Белдзяржуніверсітэт — магутная навучальная і навуковая ўстанова. Я гэта заяўляю з усёй адказнасцю, паколькі наведаў дзясяткі ўніверсітэтаў у свеце. І гэта проста недаравальна, калі мы знаходзімся ўнізе рэйтынгу, напрыклад, па прычыне адсутнасці публікацый навуковых работ на англійскай мове. Таму мы паслядоўна пачалі праводзіць працу па прэзентацыі ў інтэрнэце нашых дасягненняў, нашай навуковай работы, навуковых артыкулаў, працаваць над англамоўнай версіяй сайта. Зараз мы працуем над тым, каб у віртуальным абліччы на ўніверсітэцкім партале былі прадстаўлены чатыры нашы выдатныя музеі: заалагічны, гістарычны, мінералагічны і музей БДУ. Там будуць размешчаны фота- і відэаматэрыялы, апісанні экспанатаў, і можна будзе здзейсніць нават віртуальныя экскурсіі.

Мы добра разумеем, што ўсе чэрпаюць інфармацыю менавіта з інтэрнэту. І калі мы нацэленыя на пашырэнне экспарту адукацыйных паслуг, то ігнараваць інтэрнэт-рэсурс проста недаравальна. Абітурыенты і студэнты кіруюцца рэйтынгамі пры выбары месца, дзе б яны хацелі прадоўжыць навучанне. Працадаўцы цікавяцца рэйтынгамі, каб ведаць, якія ўніверсітэты рыхтуюць лепшых спецыялістаў. А самі ўніверсітэты, дзякуючы рэйтынгам, вызначаюць шляхі для пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва. Сёння ў БДУ навучаецца больш як 2 тысячы замежных грамадзян з 53 краін свету. І многія з іх упершыню пазнаёміліся з БДУ менавіта дзякуючы нашаму сайту.

Хачу дадаць таксама, што БДУ прысутнічае ўжо ў чатырох міжнародных рэйтынгах. Нядаўна, у адпаведнасці з рэйтынгам вядомага брытанскага агенцтва QS, БДУ ўпершыню ўвайшоў у ТОП-700 лепшых універсітэтаў свету і знаходзіцца ў групе ВНУ, якія займаюць 501—550 пазіцыі. А сярод універсітэтаў СНД, Усходняй і Цэнтральнай Еўропы БДУ стаў у гэтым рэйтынгу дзявятым.

***— Не магу не задаць вам яшчэ адно пытанне. Чаму старэйшы класічны ўніверсітэт, які мае статус вядучага нацыянальнага ўніверсітэта, не мае беларускамоўнай версіі сайта?***

— Справядлівая заўвага. Мы працуем зараз над гэтым пытаннем, і я вам абяцаю, што да канца гэтага года мы прадставім якасную беларускамоўную версію сайта БДУ. Спадзяюся, мы вас не расчаруем.

***— Сяргей Уладзіміравіч, прызнаюся, што калі вы вясной агучылі свае амбіцыйныя планы на прыёмную кампанію, я паставілася да іх скептычна. Нягледзячы на істотнае змяншэнне колькасці выпускнікоў агульнаадукацыйных школ, вы не сталі змяншаць свой план прыёму на першы курс. І гэта пры тым, што БДУ заўсёды «знімаў вяршкі»: адбіраў лепшых з лепшых абітурыентаў. Не баяліся, што давядзецца выбіраць лепшых з горшых, каб запоўніць не толькі платныя, але і бюджэтныя месцы?***

— Шчыра кажучы, я хваляваўся да самага канца. Аднак вынікі прыёмнай кампаніі пераўзышлі нашы чаканні. У юбілейны год у нас адбыўся не толькі самы вялікі, але і адзін з самых якасных нашых набораў. На ўсе формы навучання ў БДУ было залічана 6 386 чалавек ( у папярэднім годзе — 6 218). На дзённую бюджэтную форму навучання паступілі 120 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, а таксама 448 медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай каледжаў і тэхнікумаў (гэта 21,4 працэнта ад агульнай колькасці залічаных). Сярод студэнтаў, залічаных па агульным конкурсе, 819 чалавек набралі 300 балаў і больш, што складае 41,6 працэнта ад агульнай колькасці залічаных. Адпаведна адбыўся і рост прахадных балаў...

Сярод залічаных на дзённую платную форму навучання ў нас 108 медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай. У 10 працэнтаў залічаных на дзённую платную форму навучання былі вельмі высокія балы — 300 балаў і больш, а 200 балаў і больш мелі 68 працэнтаў залічаных. На завочную бюджэтную форму навучання сярэдні конкурс склаў 1,7 чалавека на месца, а на платную 1,4 чалавека.

Натуральна, усіх цікавіць, адкуль такія вынікі на фоне неспрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыі? Я лічу, што **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт — гэта раскручаны нацыянальны брэнд, які карыстаецца папулярнасцю як сярод моладзі, так і сярод працадаўцаў. БДУ — вышэйшая навучальная ўстанова з багацейшымі традыцыямі еўрапейскай класічнай вышэйшай школы. Якасць універсітэцкай адукацыі пацвярджаецца тым, што нашы дыпломы знаходзяць прызнанне ў большасці краін свету.** Разам з тым якасныя і колькасныя паказчыкі сёлетняй прыёмнай кампаніі гэта яшчэ і вынік нашай актыўнай, можа нават крыху агрэсіўнай, прафарыентацыйнай кампаніі, вынік адкрыцця ва ўніверсітэце новых, запатрабаваных рынкам працы спецыяльнасцяў і напрамкаў.

Сваёй заслугай мы лічым і тую акалічнасць, што, дзякуючы актыўнай прафарыентацыйнай рабоце, у нас істотна павялічылася прадстаўніцтва сярод студэнтаў жыхароў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Адпаведна зменшылася сярод студэнтаў колькасць мінчан: зараз сярод першакурснікаў БДУ толькі кожны трэці — мінчанін, што адпавядае статусу БДУ як вядучага нацыянальнага ўніверсітэта краіны.

***— А вам як матэматыку не крыўдна, што падрыхтоўка абітурыентаў па дакладных навуках апошнім часам моцна «кульгае»? З аднаго боку, да вас ва ўніверсітэт ідуць навучацца пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, але побач з імі аказваюцца і ўладальнікі не вельмі высокіх балаў у сертыфікатах... Як вы ставіцеся да ўвядзення мінімальнага тэставага бала для прэтэндэнтаў на атрыманне вышэйшай адукацыі і павышэння «вагі» профільнай дысцыпліны ў агульнай суме балаў сертыфікатаў ЦТ? А можа, увогуле трэба вярнуць БДУ права праводзіць самастойна профільныя іспыты на прыродазнаўчыя і матэматычныя спецыяльнасці?***

— Я адназначна падтрымліваю ўвядзенне ніжняга парога для сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання, паколькі ва ўмовах адсутнасці конкурсу **мы вымушаны залічваць на свабодныя месцы абітурыентаў з любымі баламі. Асабліва гэта актуальна для платнай формы навучання.** Аднак і на завочнай бюджэтнай форме навучання на сямі спецыяльнасцях і напрамках конкурс сёлета адсутнічаў, таму там былі залічаны ўсе, хто падаў дакументы.

Павышэнне «вагі» профільнай дысцыпліны мы таксама вітаем, паколькі гэта дасць магчымасць прымаць ва ўніверсітэт найбольш падрыхтаваных па канкрэтных профілях маладых людзей. Дарэчы, калі былі прааналізаваныя вынікі падрыхтаванасці абітурыентаў, залічаных на першы курс дзённай бюджэтнай формы навучання, высветлілася, што ў сярэднім па ўніверсітэце адзнака па мове і сярэдні бал атэстата складалі 56 працэнтаў, а профільныя іспыты — толькі 44 працэнты ад агульнай колькасці балаў. Атрымліваецца, што адзнакі па профільных прадметах, якія павінны несці інфармацыю пра здольнасці будучых студэнтаў засвойваць праграму пэўнай спецыяльнасці, насамрэч маюць невысокую «вагу». Самая сумная сітуацыя назіралася на фізічным факультэце, дзе мова і сярэдні бал атэстата складалі 63 працэнты, а фізіка і матэматыка — усяго 37 працэнтаў ад агульнай колькасці балаў.

Што тычыцца правядзення самастойных уступных іспытаў ва ўніверсітэце, то мяркую, што абітурыенты ў гэтым выпадку проста не стануць рызыкаваць і аддадуць перавагу тым ВНУ, дзе прымаюць сертыфікаты ЦТ. А вось у правядзенні алімпіяды «Абітурыент БДУ» з правам залічэння яе пераможцаў у кола студэнтаў мы зацікаўленыя. Гэта была б рэальная магчымасць адабраць высокаматываваных абітурыентаў, для якіх, магчыма, здаць тэст больш складана, чым справіцца з алімпіяднымі задачамі.

> **Крызіс у прыродазнаўча-навуковай адукацыі закрануў практычна ўсе эканамічна развітыя краіны свету. Гэта агульнасусветная тэндэнцыя, але для Беларусі яна асабліва небяспечная...**

***— Нядаўна з вуснаў кіраўніка Парка высокіх тэхналогій прагучалі сур'ёзныя абвінавачанні на адрас вышэйшай школы. Маўляў, у Беларусі на 1 тысячу насельніцтва выпускаецца толькі 7 інжынераў. А прапорцыя паміж гуманітарнымі і тэхнічнымі спецыяльнасцямі складваецца 70 на 30, у той час як у развітых краінах свету наадварот — толькі 30 працэнтаў студэнтаў атрымліваюць гуманітарную адукацыю. А як, на вашу думку, можна было б прастымуляваць цікавасць моладзі да інжынерна-тэхнічных, матэматычных і прыродазнаўчых спецыяльнасцяў?***

— Крызіс у прыродазнаўча-навуковай адукацыі закрануў практычна ўсе эканамічна развітыя краіны свету. Дзе б я ні быў, паўсюдна чую, што маладыя людзі хочуць навучацца на эканамістаў, юрыстаў, менеджараў, дыпламатаў... Магчыма таму, што сучасны ўзровень развіцця матэматыкі і фізікі настолькі высокі, што вучоба патрабуе ад маладых людзей шмат намаганняў. А з пункту погляду сучаснай моладзі такія намаганні не заўсёды апраўдваюцца на выхадзе з ВНУ... Гэта агульнасусветная тэндэнцыя, але для Беларусі яна асабліва небяспечная, паколькі наша краіна мае мноства высокатэхналагічных навукаёмістых вытворчасцяў, для развіцця якіх неабходныя добра падрыхтаваныя інжынерна-тэхнічныя кадры.

Для таго, каб змяніць сітуацыю, неабходна разгарнуць агітацыю тэхнічнай, прыродазнаўча-навуковай і матэматычнай адукацыі ў сродках масавай інфармацыі. Той жа Парк высокіх тэхналогій, вядучыя беларускія прадпрыемствы павінны больш сябе рэкламаваць, каб маладыя людзі мелі ўяўленне аб перспектывах свайго працаўладкавання пасля заканчэння ВНУ, аб сацыяльным пакеце, магчымасцях кар'ернага росту і гэтак далей. Мэтазгодна разгледзець магчымасць вяртання профільных класаў у сярэдняй школе і павелічэння колькасці вучэбных гадзін па матэматыцы і фізіцы. Гэта магло б паспрыяць умацаванню фізіка-матэматычнай падрыхтоўкі школьнікаў і прыцягненню маладых людзей на тэхнічныя і прыродазнаўча-навуковыя спецыяльнасці.

Што тычыцца вышэйшай адукацыі, то тут неабходна гарманічнае спалучэнне гуманітарнай і прыродазнаўча-навуковай адукацыі. У БДУ на дзённай бюджэтнай форме навучання на прыродазнаўча-навуковых факультэтах займаецца больш як 50 працэнтаў усіх студэнтаў. БДУ з'яўляецца найстарэйшым класічным універсітэтам у краіне, і такое размеркаванне паміж гуманітарнымі і прыродазнаўча-навуковымі спецыяльнасцямі мы лічым цалкам абгрунтаваным. Я ведаю, што гучалі прапановы плаціць студэнтам тэхнічных і прыродазнаўчых спецыяльнасцяў большую стыпендыю. Асабіста я не ўпэўнены ў мэтазгоднасці такога кроку. Нашы дэканы прапануюць прадастаўляць такім студэнтам гарантаванае месца ў студэнцкім інтэрнаце. Але цікава, за кошт каго? Хіба што за кошт філолагаў або журналістаў? Як мне бачыцца, гэта будзе не зусім справядліва...

***— Сяргей Уладзіміравіч, прызнайцеся, што было для вас прасцей: кіраваць Аб'яднаным інстытутам праблем інфарматыкі, якому вы прысвяцілі 20 гадоў свайго жыцця, ці апынуцца ў крэсле рэктара БДУ? Наколькі істотна змяніўся маштаб задач, якія даводзіцца вырашаць кіраўніку вядучага нацыянальнага ўніверсітэта? І ці не ўзнікала ў вас патаемнай думкі: вось каб зноў вярнуцца толькі да навуковай работы? Асабліва ў клапотны юбілейны год?***

— Безумоўна, рэктар БДУ — гэта не дырэктар інстытута. Як вы правільна заўважылі, гэта зусім іншы маштаб работы, іншая нагрузка і іншая адказнасць. Таму адважыцца на гэты крок мне было зусім не проста. Але мяне паклікалі ў родную альма-матар, якая дала мне пуцёўку ў вялікую навуку і дзе я займаўся выкладчыцкай работай паралельна з працай у інстытуце Акадэміі навук. На жаль, для заняткаў навуковай працай часу сёння практычна не застаецца. Калі раней я мог выдзеліць для навукі прыкладна 20 працэнтаў свайго часу, то зараз толькі 3-5 працэнтаў. Тым не менш, навуковыя артыкулы пішуцца, у мяне ёсць свае вучні і ў Акадэміі навук захавалася мая лабараторыя. А ў Белдзяржуніверсітэце ў нас склалася выдатная каманда. Універсітэт развіваецца і расце па ўсіх паказчыках: па колькасці студэнтаў, у тым ліку з кола замежных грамадзян, колькасці абароненых дысертацый, даходаў ад навуковай дзейнасці, паказчыкаў экспарту, заключаных міжнародных дагавораў і гэтак далей. А калі ўсё атрымліваецца, ствараецца, будуецца, гэта прыносіць задавальненне. Табе хочацца рухацца далей. Асабліва цікава мне заўсёды гутарыць са студэнтамі. Сучасныя маладыя людзі вельмі разумныя і дапытлівыя. Нядаўна я сустракаўся з першакурснікамі ў «Брыганціне». Прызнаюся, што рыхтаваўся да сустрэчы з імі і хваляваўся, як перад экзаменам. У мяне пыталіся пра ўсё на свеце: і пра мой самы складаны ў жыцці экзамен, і пра каханне...

***— Цікава, ці вытрымаў рэктар БДУ іспыты перад сваімі студэнтамі?***

— Вельмі на гэта спадзяюся...

***— Дзякуй вам, Сяргей Уладзіміравіч, за гутарку. І прыміце нашы віншаванні з юбілеем!***

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## На аўдыенцыю да Вітаўта

**Хочаце сустрэцца з самім вялікім князем Літоўскім Вітаўтам і польскім каралём Ягайлам? Тады завітайце ў Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Тут можна будзе пабачыць партрэтныя скульптуры дзяржаўных дзеячаў, выкананыя ў поўны рост. Рэканструкцыя постацяў рабілася на падставе дасканалага вывучэння гістарычных крыніц і іканаграфіі.**

Вобраз Вітаўта адноўлены паводле выявы з асабістай пячаткі князя, мініяцюры на прастоле пачатку XVI стагоддзя і гравюры з кнігі, якая датуецца 1578 годам. Каб стварыць Ягайлу, узята пластыка надмагілля караля, а касцюм «запазычаны» з выявы абраза «Пакланенне трох каралёў».

Рэканструкцыя зроблена сябрамі Беларускага саюза мастакоў Паўлам Лукам і Юрыем Піскуном.


**ИНФОРМАЦИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ФИНАНСОВО-ХОЗЯЙСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «СЛЕПЯНКА» за 2010 год**

| № строки | Наименование показателей | Ед. изм. | За отчетный период |
|---|---|---|---|
| 1 | Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) | Млн руб. | 4874,00 |
| 2 | Себестоимость реал. товаров, продукции, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | Млн руб. | 5176,00 |
| 3 | Прибыль (убыток) за отчетный период, всего | Млн руб. | -348,0 |
| 3.1. | в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции (работ, услуг) | Млн руб. | -302,0 |
| 3.2. | в том числе: прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | Млн руб. | 0,00 |
| 3.3. | в том числе: прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | Млн руб. | -46,00 |
| 4 | Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли | Млн руб. | |
| | Чистая прибыль | Млн руб. | -348,0 |
| | Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | Млн руб. | -622,00 |
| 5 | Просроченная дебиторская задолженность (долгосрочная) | Млн руб. | 0,00 |
| 6 | Просроченная кредиторская задолженность (долгосрочная) | Млн руб. | 0,00 |
| 7 | Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | Млн руб. | 0,00 |
| 8 | Количество акционеров, всего в том числе: | Лиц | 111 |
| 8.1. | Юридических лиц | Лиц | 1 |
| 8.2. | Физических лиц | Лиц | 110 |
| 9 | Среднесписочная численность работающих | Чел. | 58 |

УНП 100199509



ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».**

**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**

**Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**

**Кантактны тэлефон: 292 44 12.**

**e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by.**

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**

**ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30 25.10.2011 г.**


# ДЗЕЦІ НЕ АДЧУВАЮЦЬ БАР'ЕРАЎ

**Гэта не проста навучальная ўстанова з пэўнымі дасягненнямі. Гэта месца, дзе фарміруюцца погляды, дзе мяняюцца стэрэатыпы. Я хачу прысвяціць гэты матэрыял тром маленькім героям, кожны з якіх, я думаю, здольны даць свой урок.**



Крысціна

## Елісей: мэтанакіраванасць

Дасягненнем гэтага хлопчыка можна толькі дзівіцца. Ён чытае, складвае лічбы. Абзавёўся сябрамі ў інтэрнэце. І гэта прытым, што ў Елісея цяжкія пашкоджанні мовы, пры якіх ён не можа размаўляць са сваімі равеснікамі, і слабыя рукі, каб пісаць у сшытку. Для працы і зносін ён выкарыстоўвае ноўтбук, літаркі і лічбы на якім набірае падбародкам.

З Елісеем мы пазнаёміліся на... марскім дне. Так аформлены клас, у якім у мінігрупах займаюцца дзеткі, якія маюць праблемы ў навучанні ці цяжкае пашкоджанне мовы. Мяккія сцены, на якіх можна намацаць розныя фігуркі, шарыкавы басейн, скрыня з пяском, маты і дыван, крэсла для рэлаксацыі — усё гэта выкарыстоўваецца не толькі для сэнсорнага развіцця, але і дапамагае дзецям засвойваць розныя навукі. Прычым тыя ж матэматыку і чытанне дзеці могуць спасцігаць не толькі седзячы за партамі, але і, напрыклад, размясціўшыся на дыване і слухаючы настаўніцу з-за шырмы, або гледзячы спектакль. Усё ж такім дзеткам нават высядзець урок ужо выпрабаванне, дыягназы даюцца ў знакі, малыя хутчэй стамляюцца. Таму хлопчыкі і дзяўчынкі, якія маюць складанасці ў навучанні альбо ў іх цяжкія пашкоджанні мовы, на прадметах «матэматыка», «руская мова», «чалавек і свет» займаюцца з педагогам-дэфектолагам асобна ад сваіх здаровых аднакласнікаў. Затое на ўроках музыкі, працы, мастацтва і на школьных святах хворыя і здаровыя дзеткі разам.

25-я школа ў мікрараёне Брылевічы, дзе ёсць класы з інтэграваным навучаннем, у асноўным дапамагае хлопчыкам і дзяўчынкам з дзіцячым цэрэбральным паралічом.

Сёння ў 25-й школе тры інтэграваныя класы, і побач са здаровымі дзеткамі атрымалі магчымасць навучацца 11 хворых. Усяго ж у школе тысяча вучняў.

Як тут упэўнены, галоўнае — прытрымлівацца балансу — дзетак з асаблівасцямі не павінна быць шмат, інакш гэта не будзе інтэграцыяй, і наўрад ці такую ўстанову будуць успрымаць як звычайную агульнаадукацыйную школу.

У адным класе максімум можа быць чатыры хворыя дзіцяці. Прычым для іх ствараюцца ўмовы, каб малыя не адчувалі сябе ізаляванымі. Так, дзеткі з асаблівасцямі не вучацца ў адным месцы — на працягу дня ім даводзіцца некалькі разоў перамяшчацца праз доўгі школьны калідор, каб з класнага памяшкання, напрыклад, трапіць у клас карэкцыйнага навучання. І ў школе нікога ўжо не здзіўляе, што па калідоры праязджае каляска...

Цікава, што многія праблемы, якія малявала свядомасць дарослых, як высветлілася, для дзяцей не існуюць. Так, у школе апасаліся дзіцячай жорсткасці альбо наадварот, ранімасці, калі здаровыя дзеці сутыкнуцца з тым, пра што раней не ведалі, і будуць пакутаваць. Але дзіцячаму насельніцтву школы чужыя катэгорыі норма — не норма, яны не адасабляюцца ад хворых дзяцей. Хутчэй наадварот.

Так, калі Елісей прыязджае на агульныя заняткі, аднакласнікі акружаюць яго. Аблепліваюць, як мурашы, нешта распавядаюць, разумеюць на ўзроўні позіркаў і жэстаў, імкнуцца дапамагчы. Мы бачылі, як малыя шчыра радаваліся яго прыезду. Відаць, справа не столькі ў тым, што ў дзецях абуджаецца спачуванне, тут нешта іншае. Магчыма, здаровыя дзеці проста адчуваюць, як Елісей цэніць тое, што яны побач.

— Елісей вялікі малайчынка. Ён стараецца не толькі на ўроках. Калі хлопчык прыйшоў да нас у школу, здавалася, што з каляскі, на якой яго возяць, ён ніколі не ўстане. А сёння яго маці бярэ пад рукі і ён перасоўваецца. Магчыма, тое, што ён знаходзіцца побач са здаровымі дзецьмі, стымулюе яго на такія подзвігі. Калі сабраць адных хворых разам — то ўсе размовы і думкі будуць толькі пра хваробы. І зусім іншы настрой і матывацыя, калі побач кіпіць жыццё, здаровае жыццё, — заўважае намеснік дырэктара Таццяна Бандарэнка.

## Стас: аптымізм

Стасік першым пачаў размову: «Гэты артыкул я захаваю на памяць»... Думаю, што ўсяму 1-му «Е», дзе зараз вучыцца гэты жыццярадасны, гаваркі хлопчык, вельмі пашанцавала. Гэта як цёплае сонейка, гатовае з усімі падзяліцца сваім светлым настроем. Стас у захапленні ад школы, ён заўсёды чакае заняткаў, і на якім уроку мы яго у гэты дзень не сустракалі, хлопчык заўсёды ўсміхаўся. Ён нават маці кажа, што не будзе хварэць, каб не прапускаць школу. І гэты аптымізм — заразная рэч. Некаторыя дзеткі раздзяляюць захапленні Стаса і нават могуць выдаць нешта кшталту «гэта не школа, а суцэльнае задавальненне». На ўсіх занятках Стас разам з аднакласнікамі, нават калі ў дзяцей фізкультура, ён займаецца побач са сваім трэнерам — робіць адаптыўныя практыкаванні. Ці спраўляецца Стас на ўроках, цікаўлюся ў яго мамы Алены Чалядзінскай, якая суправаджае хлопчыка.

— Пісаць і чытаць ён навучыўся яшчэ да школы. Адзіная праблема ў тым, што яму цяжка трымаць руку, каб пісаць. Любімы прадмет у яго — фізкультура. Ён бачыць, як усе дзеці займаюцца. І для яго гэта стымул. Бо ён там, дзе ўсе, ён такі, як усе! — заўважае Алена Мікалаеўна. — У сына змянілася стаўленне да дзяцей. Яго некалькі разоў крыўдзілі ў двары, на дзіцячай пляцоўцы, і ён пабойваўся дзяцей. Зараз ён думае па-іншаму, ён упэўнены, што ўсе добрыя, што ўсе яму дапамогуць. Калі мы ідзём на заняткі, дзеці падбягаюць, вітаюцца, хапаюць яго за руку, дапамагаюць дайсці, усаджваюць, дапамагаюць кніжкі раскласці. Раней ён баяўся мяне адпускаць: гэта былі істэрыкі, страх у вачах, слёзы — мама заўсёды павінна быць побач, сядзець з ім на ўроках. Зараз ён нават кажа: «Мама, мне без цябе лепей, я з дзецьмі гуляю».

— На ваш погляд, што павінна змяніцца ў краіне, каб дзеці з абмежаваннямі маглі сябе камфортна адчуваць?

— Павінна змяніцца стаўленне людзей. Мы баяліся, як дзеці будуць ставіцца да хворых малых. Але ў дзяцей усё нармальна. Напружвае стаўленне дарослых. Хворых дзяцей многія ўспрымаюць нейкімі няшчаснымі, беднымі. А яны нічым не адрозніваюцца ад іншых, у іх толькі праблема са здароўем. Гэтым дзецям не патрэбна шкадаванне, ім гэта вельмі не падабаецца...

Вядома, камфортная інтэграцыя — гэта яшчэ і заслуга педагогаў школы. Усё ж — вялікае майстэрства так арганізаваць вучэбны працэс, каб усе адчувалі ад гэтага толькі карысць. Тым больш што тут выкарыстоўваюцца перадавыя тэхналогіі. Дзеці з задавальненнем займаюцца ў легатэцы. Хіба тыя ж першаклашкі не палюбяць школу, у якой, напрыклад, матэматыку яны засвойваюць за канструктарам. «Лега», прычым у незвычайным класе, які хутчэй нагадвае гульнявы пакой? Атрымліваецца, што педагогі школы, шукаючы тэхналогіі, якія дапамагалі б хворым дзецям (праца з канструктарам — гэта сэнсорныя заняткі, якія вельмі карысныя для дзетак з ДЦП), ствараюць тое, што служыць для ўсёй школы.

25-я школа — з мастацкім ухілам. І таму тут для дзетак з асаблівасцямі ёсць умовы, каб займацца арттэрапіяй. І тут здаровыя дзеткі могуць многаму павучыцца ў хворых. «У такіх дзетак разумовае развіццё можа ісці наперадзе фізічнага. Яны нестандартна мысляць, у іх няма столькі стэрэатыпаў, як у здаровых малых. Яны з гліны робяць шыкоўныя рэчы, і шмат што з таго я выкарыстоўваю ў працы са здаровымі дзеткамі», — заўважае педагог па кераміцы Ірына Фаставец.

## Крысціна: незалежнасць

— Крысціна, у цябе ёсць памочнікі? — цікаўлюся ў вучаніцы чацвёртага класа.

— Мне больш падабаецца, калі я ўсё раблю сама, — крыўдзіцца дзяўчынка.

Яна без праблем перасоўваецца па школе на калясцы, даганяе на ёй сваіх аднакласнікаў і нават займаецца бальнымі танцамі на калясцы!

У школе створана безбар'ернае асяроддзе. У калідорах і актавай зале ёсць пандусы, функцыянуе ліфт. І, напэўна, пра стварэнне такога безбар'ернага асяроддзя павінны паклапаціцца ва ўсіх школах. На жаль, хворых дзетак не становіцца менш, а ў краіне зараз вядзецца праграма, якая прадугледжвае закрыццё спецыяльных школ і максімальнае размеркаванне дзяцей з асаблівасцямі па агульнаадукацыйных школах... Крысціна ў 25-й школе займаецца з другога класа. А да гэтага дзяўчынка была на надомным навучанні, пра што можа толькі з сумам узгадаць, што заканчваліся заняткі, настаўнік сыходзіў, а яна заставалася адна. Можа, таму Крысціна так любіць школу і так цэніць незалежнасць.

Дарэчы, калі гэтая дзяўчынка цалкам з усімі перашкодамі спраўляецца сама, то тут навучаюцца і дзеткі, якім не абысціся без дапамогі. Пры кожным з такіх вучняў павінен быць суправаджальнік — гэта могуць быць бацькі альбо памочнік выхавацеля. І школа з інтэграцыйным навучаннем лічыць, што ёй вельмі пашанцавала, што Маскоўскі райвыканкам пайшоў насустрач і тут адкрыта такая штатная адзінка, як памочнік выхавацеля. Але гэта адзін чалавек на ўсіх дзетак! Часам яе рук не хапае, бо дапамога можа спатрэбіцца некалькім дзеткам адначасова.

І калі раптам такі чалавек захварэе — гэта катастрофа для школы. Тут ужо падключаюцца ўсе, нават дырэктар. Дзяцей перадаюць з рук у рукі.

Гэтую праблему трэба вырашаць. Дарэчы, за мяжой існуе інстытут асістэнта інваліда. Гэта не толькі магчымасць для дзяцей з асаблівасцямі вучыцца ў звычайнай школе, гэта яшчэ і свабода для маці, якой, пагадзіцеся, усё ж трэба мець час і на тое, каб адпачыць ад сваіх праблем, і на тое, каб адчуць сябе патрэбнай у грамадстве, уладкавацца на працу.

— Трэба падымаць прэстыж такой прафесіі і рабіць хоць крыху большы заробак, — заўважае дырэктар 25-й школы Марына Ільіна. — Я думаю, што павінен быць прыняты закон, у якім было б прапісана, што дзеці з абмежаваннямі павінны пры сабе мець суправаждальніка. Для дзяцей гэта — рукі, ногі, як для нашага Елісея — мова, бо першы год маці ад яго амаль не адыходзіла, прычым больш для таго, каб ён засвойваў праграму. Яна перакладала тое, што сын хоча сказаць.

На мой погляд, больш эфектыўна было б, калі б асістэнт інваліда меў пэўную адукацыю, таму што ён не толькі абслугоўвае дзяцей — дапамагае дайсці да сталовай, туалета, — але і гутарыць з імі. У другой палове дня асістэнты маглі б і займацца з хворымі дзецьмі, і яшчэ больш даваць ім.

Дарэчы, 25-я школа зусім яшчэ маладая — яна працуе толькі трэці год, і тым не менш, паспела ўжо добра зарэкамендаваць сябе, і колькасць бацькоў, якія сюды хочуць аддаць сваіх дзяцей, з кожным годам расце.

— Інтэграцыя — гэта толькі адзін з кірункаў працы, не хочацца яго асабліва вылучаць. У тым і сэнс інтэграцыі, каб хворыя дзеці былі не на нейкім асаблівым становішчы, а на роўных. Які дэвіз указаны на нашай эмблеме, так мы і будуем працу, — разам да намечанай мэты. А мэта ў нас адна — добрая адукацыя, выхаванне. Наш калектыў лічыць, што для ўсіх дзяцей трэба ствараць ДОБРУЮ школу, — упэўнена дырэктар.

Мы хочам паказаць, што інтэграцыя — гэта плюс навучальнай установе. І адзін, і другі бок маюць выгаду. Дзеці з абмежаваннямі могуць атрымліваць адукацыю ў звычайных умовах. Для дзяцей здаровых — гэта выдатны патэнцыял добрага сэрца, выхаванне, якое ў іншых умовах немагчымае.

Настаўнікі нават заўважаюць, што дзеткі ў інтэграваных класах моцна мяняюцца, яны становяцца больш уважлівымі адзін да аднаго, чулымі, нават мяняецца іх мова. Яны часцей кажуць «калі ласка»...

Мы правялі ў школе амаль цэлы вучэбны дзень. У галаве ўжо вымалёўвалася пэўная карцінка — прычым карцінка не канкрэтнай школы, а пэўнай мадэлі грамадства, дзе для хворых няма абмежаванняў. І тут мы заўважылі тое, што прымусіла задумацца. На перапынку ў калідоры гулялі дзеці. Ля калоны стаяў хлопчык. Ён не можа перамяшчацца без дапамогі, таму проста рухаўся ўздоўж апоры. У гэты час яго аднакласнікі гулялі ў даганялкі. Але абмежаваны ў рухах хлопчык таксама быў у гульні. Дзеці бегалі вакол яго. Часам яны перакідваліся словамі, абменьваліся нейкімі жэстамі, смяяліся. І менавіта ў гэты момант мы не проста зразумелі — адчулі, што розніцы няма.



Стас

**Свет не дзеліцца на хворых і здаровых. Дзеці не адчуваюць ніякіх бар'ераў. Іх штучна ствараем мы, дарослыя. І хочацца верыць, што калі-небудзь тое, што само па сабе адбываецца ў гэтай школе, стане зразумелым усім. Але як доўга трэба да гэтага ісці? Ці можна гэтаму навучыцца ў дзяцей? Тым больш спачатку нам трэба проста навучыцца ўспрымаць, што людзі з фізічнымі абмежаваннямі побач з намі — гэта звычайная з'ява. А пасля навучыцца... не заўважаць іх. Не бянтэжыць адведзенымі ў бок позіркамі. Не крыўдзіць шкадаваннем і спачуваннем. Не прыніжаць асаблівай увагай. Не вылучаць і не адасабляць як «не такіх, як усе».**

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

# НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ КІНУЦЬ КАМЕНЬ...

**У карпункт газеты патэлефанавала абураная чытачка, каб выразіць сваю нязгоду з матэрыялам «Мінулае мінула» («Звязда»за 19 кастрычніка). Справа ў тым, што ў інтэрнаце па Савецкай Канстытуцыі, дзе абсталяваны два пакоі ў якасці часовага прытулку для былых зняволеных, жывуць яе дзеці. Марыя Іванаўна (так яна, прынамсі, назвалася) горача даводзіла, што сяліць сумніўны «кантынгент» побач з «нармальнымі людзьмі» ні ў якім разе нельга. «Былыя зэкі абавязкова прынясуць з сабой парадкі «зоны», тут звычайнымі стануць п'янкі, гулянкі з усімі магчымымі наступствамі. Паселяць чатыры ці пяць чалавек — да іх прыйдзе яшчэ дзесяць, — не давала нават слова ўставіць жанчына. — Моладзь будзе глядзець на ўсё гэта... Няхай бы вызвалілі для такой установы барак (ёсць такія, напрыклад, на вуліцы Герояў абароны Брэсцкай крэпасці), папярэдне адсяліўшы жыльцоў у асобныя кватэры, ды выдзелілі б там гэтым людзям пакоі. А так улады робяць абы-што, а вы іх падтрымліваеце...»**

Я прапанавала чытачцы выкласці свае меркаванні на паперы. Яна сказала, што, можа, потым, як збярэцца з думкамі, як утаймуе хваляванне, трохі супакоіцца. Вельмі ж эмацыйна выкладвала жанчына-маці сваю пазіцыю. Яна гаварыла многа, казала, што я сама не ведаю нічога пра падобны «кантынгент», таму і пішу лёгка.

Вось тут шаноўная Марыя Іванаўна памыляецца. Адразу пасля заканчэння ўніверсітэта я працавала ў пружанскай раённай газеце. Жыла ў інтэрнаце адной будаўнічай арганізацыі, дзе амаль трэць паверха нейкі час займалі так званыя «хімікі» — гэта значыць, асобы, якія адбывалі пакаранне ва ўмовах вольнага пасялення. Не сказаць, што яны паводзілі сябе вельмі буйна. Але ж некалькі інцыдэнтаў было... Разы два яны так моцна стукаліся ў дзверы нашага пакоя, што выломвалі ручку звонку. Гэта азначала, што ранкам з пакоя не было ніякай магчымасці выйсці. Мне на працу даводзілася збірацца раней за ўсіх (таварышкі працавалі ў бібліятэцы, у іх чытальная зала адчынялася толькі ў 11 гадзін). Яшчэ шчасце, што наш пакой на другім паверсе выходзіў акном на казырок уваходных дзвярэй. Таму я вылазіла на той самы казырок і прасіла каго-небудзь аб дапамозе. Дапамога звычайна прыходзіла ў выглядзе нефармальнага старасты нашага паверха, добрага хлопца Сашы, які браў падручны інструмент у сваім КаМАЗе і адчыняў нашы дзверы.

Успомніўшы той далёкі эпізод, падумала, што цяпер, стоячы амаль на даху, я званіла б і начальніку міліцыі, і кіраўніку раёна, каб паведаміць аб парушэнні сваіх грамадзянскіх правоў і паклікаць на дапамогу. А тады, па-першае, не было тэлефонаў, а па-другое, у галаву не магло прыйсці нічога такога. Вызвалілі, ну і дзякуй Богу, хутчэй — на працу.

Прыводжу той амаль анекдатычны выпадак для таго, каб сказаць, што такія праблемы існавалі і іх нейкім чынам вырашалі ва ўсе часы. Добра, што мы ўвогуле можам іх зараз выносіць на абмеркаванне, выказваць сваю пазіцыю, прыцягваць увагу грамадскасці.

Нядаўна прачытала ў расійскай прэсе, што ў Варонежы адкрываюць прытулак на 200 месцаў. Для гэтага адсялілі два старыя дамы, зрабілі там капітальны рамонт. Але насельнікі суседніх кварталаў, мякка кажучы, не ў захапленні ад рашэння ўладаў. Яны лічаць, што такая колькасць былых зняволеных — гэта перадумова для стварэння ачага крыміналу. І гэта цалкам верагодна. Ды і ў Расіі зусім іншая сітуацыя. Там падобныя мерапрыемствы праводзяцца на спонсарскія сродкі. Бо многія багатыя маюць досвед адсідкі — таму і ахвяруюць шчодра. У нас жа прытулкі абсталёўваюцца за дзяржаўныя грошы, і няма магчымасці будаваць асобныя памяшканні.

І абсталяванне тых некалькіх пакояў у брэсцкім інтэрнаце — гэта, напэўна, нейкі сродак вырашэння хоць часткі праблемы. Людзі, якія працуюць з вышэйназванымі асобамі, гатовы прыводзіць дзясяткі прыкладаў, калі чалавек, няхай і былы злачынца, вернецца на волю, памыкаецца без жытла, без грошай ды і зноў трапляе за краты. Але папярэдне ён некага абрабуе, нешта ўкрадзе. Гэта значыць, зноў з'явяцца ахвяры злачынстваў. Усё роўна ж яны пасля калоніі вяртаюцца ў грамадства, дзе ўсе мы жывём. Дык лепш працягнуць руку дапамогі хаця б таму, хто здольны гэтую дапамогу прыняць. Лепш для ўсіх нас. Тым больш што ўсе мы цудоўна ведаем: па-рознаму людзі трапляюць за краты, і розныя там бываюць вязні. А сярод нас часта ходзяць тыя, па кім сапраўды плача турма. Таму, можа, і не варта ўсіх мераць на адзін капыл.

Што датычыць таго інтэрната, пра які так непакояцца жыльцы, іх бацькі (і іх можна зразумець), то начальнік крымінальна-выканаўчай інспекцыі Маскоўскага РАУС Брэста і яго калегі з абласнога ўпраўлення казалі, што кантроль будзе жорсткі. Жылплошчу атрымаюць толькі тыя людзі, якія падаюць надзею на выпраўленне. У рэшце рэшт, пакоі выдзелілі не навечна. Калі ўзнікнуць праблемы, адпаведныя рашэнні можна і перагледзець.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Кватэрнае пытанне

# РАЗЛІЧВАЦЬ МОЖНА НА КРЭДЫТ...

***Наш сын з жонкай і дзецьмі жыве ў вельмі старым трохкватэрным доме без ніякіх выгод. Сваякі раяць яму пісаць у вышэйшыя інстанцыі, выклікаць камісіі, дамагацца, каб гэты дом прызналі непрыдатным для сучаснага жыцця, не адпаведным сённяшнім патрабаванням.***

***Калі гэта ўсё ж адбудзецца, ці варта сям'і сына, яго суседзям разлічваць на выдзяленне новых кватэр?***

**А. Р.,** *Дзяржынскі раён.*

У адпаведнасці з падп. 3.1.3 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзялення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 года № 565) пражыванне ў жылым памяшканні, якое прызнана неадпаведным санітарным і тэхнічным патрабаванням, што прад'яўляюцца да жылых памяшканняў, з'яўляецца адной з падстаў для прызнання грамадзян асобамі з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў і пастаноўкі ў вызначаным парадку на кватэрны ўлік.

Акрамя таго, для грамадзян, якія пражываюць у жылых памяшканнях, прызнаных у вызначаным парадку непрыдатнымі для пражывання, устаноўленыя льготы на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі ў выпадку выказвання імі жадання пабудаваць або набыць ва ўласнасць добраўпарадкаванае жыллё.

Так, у адпаведнасці з падп. 1.10 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 года № 185 «Аб выдзяленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў» названыя грамадзяне па-за чаргой могуць быць уключаны ў спісы на атрыманне льготных крэдытаў. Згодна з падп. 1.11 гэтага ўказа ім дадзена таксама права на сумеснае выкарыстанне льготнага крэдыту і аднаразовай бязвыплатнай субсідыі на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў.

**Віктар САВІЦКІ.**

**КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец)**
**извещает о проведении 29 ноября 2011 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование | Адрес объектов | Начальная цена продажи объекта с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Двухэтажное кирпичное здание растворо-бетонного узла с двумя галереями и двумя бункерами с инвентарным номером 320/С-15039, площадью 285,7 кв.м; двухэтажное кирпичное здание ремонтно-механических мастерских с пятью гаражными боксами с пристроенной кузницей и подъездной дорогой с инвентарным номером 320/С-15034, площадью 1002,6 кв.м; одноэтажное кирпичное здание склада цемента с четырьмя стальными емкостями и повышенным путем с инвентарным номером 320/С-15035, площадью 45,7 кв.м; одноэтажное кирпичное здание склада с пристроенным навесом с инвентарным номером 320/С-15033, площадью 1391,3 кв.м; одноэтажное кирпичное здание котельной с инвентарным номером 320/С-15037, площадью 105,8 кв.м; кабельная линия 10кВт с инвентарным номером 320/С-25843, протяженностью 1214,3 м; двухэтажное кирпичное здание растворо-бетонного узла, находящегося в стадии незавершенной реконструкции с пристроенным кирпичным гаражом с инвентарным номером 320/С-15040, площадью 431,5 кв.м; одноэтажное кирпичное здание проходной с инвентарным номером 320/С-16765, площадью 38,1 кв.м; одноэтажное кирпичное здание пилорамы с инвентарным номером 320/С-15036, площадью 439,0 кв.м; трансформаторная подстанция № 711 с инвентарным номером 320/С-25865, площадью 28,5 кв.м. | Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Ленинградская, 1а | 1 483 270 020 | 148 000 000 |

